

ЯК ЛЯЧЫЦЦА БУРАКАМІ

8

ТАЯМНІЦЫ СЛУЦКІХ ПАЯСОЎ

12





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

16 СТУДЗЕНЯ 2024 г. АЎТОРАК № 10 (30144)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй ІВАНЕЦ, міністр адукацыі:**

*«У першую чаргу мы настроены на тое, каб кожны малады чалавек, які выходзіць са школьных сцен, не толькі рабіў свядомы выбар будучай прафесіі, адукацыйнай траекторыі, але і быў патрыётам сваёй краіны. Таму для школ будзем рэалізоўваць комплекс мерапрыемстваў, накіраваны менавіта на ўсвядомлены выбар прафесіі, каб выпускнік дакладна вызначыўся і разумеў, у якім кірунку яго стваральная праца будзе важная для развіцця краіны. Што датычыцца каледжаў, то тут — развіццё цэнтраў кампетэнцый, новых спецыяльнасцяў, па якіх сёння неабходна ажыццяўляць падрыхтоўку для нашай эканомікі».*

# Вучыць і вучыцца



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

У Мінскім дзяржаўным каледжы лічбавых тэхналогій навучэнцы атрымліваюць запатрабаваныя ў многіх сферах экономікі прафесіі — мехатроніка, праграміста, тэхнолага, электрамеханіка... Ад таго, якімі спецыялістамі яны стануць, як іх навучаць майстры ў каледжы, у многім будзе залежаць і якасць прадукцыі, да выпуску якой яны прычыняцца. Гэта добра разумее Мацвей ПЕТУХОЎСКІ, загадчык цэнтра кампетэнцый па робататэхніцы. У свой час ён сам скончыў гэты каледж. Кіраўніком вучэбнай групы ў яго тады была Алена ТАРАСАВА. Яна і цяпер выкладае ў каледжы спецыяльныя дысцыпліны, і маладому выкладчыку ёсць у каго спытаць параду, цяпер ужо ў справе настаўніцтва, навучання новага пакалення. Дарэчы, летась Алена Тарасава з рук кіраўніка дзяржавы атрымала дзяржаўную ўзнагароду — медаль «За працоўныя заслугі».

## КОРАТКА

- Місію назіральнікаў ад СНД на выбарах у парламент Беларусі ўзначаліць Сяргей Лебедзеў.
- З пачатку года беларускім бязвізам скарысталіся больш як 6,3 тысячы іншаземцаў.
- Насельніцтва ў 2023 годзе нарасціла дэпазіты ў беларускіх рублях і скарацíла ў замежнай валюце.
- Таджыкістан хоча стварыць у Мінску свой гандлёвы дом.
- Магчымасцю назапашвальнай пенсіі ў Беларусі скарысталіся больш як 21 тысяча чалавек.
- Жыхары Магілёўскай вобласці дадаткова пералічылі ў бюджэт Br5,2 млн падаходных падаткаў.


ISSN 1990 — 763X


На ўласныя вочы

## УСЁ І АДРАЗУ

### Што прапануе пакупнікам «Першы нацыянальны гандлёвы дом»

**Будынак, дзе размясціўся «Першы нацыянальны гандлёвы дом», яшчэ нядаўна быў вядомым сталічным даўгабудам. Згодна з першапачатковай задумкай, гэта павінен быў быць «Магніт Мінска», будаваць які пачалі яшчэ ў 2009-м. Але праект так і адзывоў у нябыт, і ў рэшце рэшт даўгабуд атрымаў «другое нараджэнне». Ён завершаны за кошт бюджэту, і цяпер гэта «Першы нацыянальны гандлёвы дом», які сабраў пад сваім дахам самыя яркія і значныя айчынныя брэнды. На верхніх паверхах будынка будуць кватэры, унізе — паркінг. Ну, а «Першы нацыянальны гандлёвы дом», вітрына найлепшай прадукцыі кожнага з рэгіёнаў нашай краіны, адкрыўся 29 снежня, на тры дні раней за заяўлены тэрмін. У адкрыцці прымаў удзел Прэзідэнт Беларусі.**




СТАР. 5

Сацыяльны стандарт

## ДАЕХАЦЬ ДА КОЖНАГА

### Калінкавіцкая раённая бальніца атрымала мабільны медыцынскі комплекс

**Атрыманне спецыяльнага аўтамабіля для медабслугоўвання ў Калінкавіцкім раёне Гомельшчыны — чаканая падзея. Раён — у шасцёрцы самых працяглых і ў дзясятцы найбуйнейшых у Беларусі. Многія з мясцовых населеных пунктаў даволі аддаленыя адзін ад аднаго. І вось ужо два тыдні як туды выязджае ў рэйсы перасоўны медыцынскі комплекс.**

СТАР. 3



З першых вуснаў

# «ДАВАЙЦЕ БУДЗЕМ ІНТЭНСІФІКАВАЦЬ НАШЫ АДНОСІНЫ»

## Закрытых тэм паміж Беларуссю і Таджыкістанам няма

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Таджыкістана ў Беларусі Бахтаварам Сафарзадой. Вітаючы госця, кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ён дасведчаны дыпламат, які добра ведае Беларусь і яе магчымасці. У сваю чаргу, беларусы добра ведаюць магчымасці Таджыкістана. «Нашы народы заўсёды паважалі адзін аднаго, дружны былі заўсёды. Нашы адносіны з Эмамалі Шарыпавічам (Прэзідэнт Таджыкістана Эмамалі Рахмон. — «Зв.») самыя развітыя, у нас няма сакрэтаў адзін ад аднаго. Таму мы выбудоўваем добрыя дружалюбныя адносіны», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў свой пастаянны тэзіс аб тым, што базай любых міждзяржаўных адносін з'яўляецца эканоміка, гандлёва-эканамічныя адносіны.**

«Міністэрства замежных спраў мяне супакойвае ў тым, што леташняе падзенне тавараабароту нязначнае і гэтак далей. Але я эканаміст і прывык у дынаміцы глядзець на працэсы. У мінулым годзе мы не нашмат знізілі тавараабарот, але да папярэдняга года. А папярэдні год даў нам прыстойнае зніжэнне тавараабароту. Таму ў цэлым мы тавараабарот знізілі», — адзначыў Прэзідэнт. У 2022 годзе тавараабарот паміж Беларуссю і Таджыкістанам раўняўся 78,1 млн долараў, а ў 2023-м — 67,4 мільёна.

«Разбураць падмурак нашых адносін нельга. Як я сказаў, аснова — гандлёва-эканамічныя адносіны. Таму трэба нам тут папрацаваць з тым, каб вярнуць тавараабарот для пачатку на тую стадыю, на якой ён знаходзіўся. Ну і, вядома, у нас дастаткова прадукцыі, тавараў для таго, каб павялічваць тавараабарот», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што 78 ці нават 100 мільёнаў тавараабароту для Беларусі і Таджыкістана — гэта амаль нішто. Таму трэба шукаць магчымасці, вызначацца з пазіцыямі, па якіх можна павялічваць гэты паказчык.

«Я ўпэўнены, Таджыкістан прыме такія прапановы. Вызначыцца па таварах, якімі мы ўзаемна можам гандляваць, абменьвацца, — сказаў беларускі лідар. — Я яшчэ раз кажу: нашы магчымасці вы добра ведаеце. У нас ёсць усё неабходнае, у чым мае патрэбу Таджыкістан у галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі, паставак аўтамабільнай тэхнікі, асабліва велікагрузаў — вы вельмі шмат працуеце па гарнаруднай прамысловасці. Мы тут можам аказаць вам значную дапамогу і падтрымку. Закрытых тэм няма, гатовы супрацоўнічаць з вамі і ў ваенна-прамысловым комплексе. Вы ведаеце нашы магчымасці. Скажыце, чым можам дапамагчы ў плане забеспячэння вашай бяспекі, мы гатовы падключыцца, хоць мы ўжо зрабілі нямала крокаў у гэтым напрамку. Вы таксама гэта добра ведаеце».

Аляксандр Лукашэнка рэзюмаваў, што праблем вельмі шмат і такая ж колькасць задач, якія патрабуюць вырашэння. Беларускі бок, па словах Прэзідэнта, да гэтага гатовы.

«Давайце будзем інтэнсіфікаваць нашы адносіны. З Эмамалі Шарыпавічам мы ў найбліжэйшы час пры першай жа магчымасці пагаворым аб тым, каб вызначыць напрамкі інтэнсіфікацыі нашых адносін. А вы як пасол вельмі актыўны, перспектыўны дыпламат, думаю, зробіце свой уклад у развіццё нашых адносін», — падсумаваў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка перадаў Эмамалі Рахмону самыя цёплыя і добрыя віншаванні і пажаданні з Новым годам. «Вельмі хачу, каб ён быў для таджыкскага народа, Таджыкістана і вашага лідара самым паспяховым», — сказаў ён.

Бахтавар Сафарзада перадаў беларускаму лідару прывітанне ад яго таджыкскага калегі. «Мы вас ведаем як вялікага сябра Рэспублікі Таджыкістан і шчырага сябра нашага лідара Эмамалі Рахмона. Ваша сяброўства з'яўляецца прадметам гонару для нас, дыпламатаў, прадстаўнікоў дзяржаўных органаў улады і двух брацкіх народаў дзвюх краін», — сказаў ён.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

У тэму

### ДАГНАЦЬ І ПЕРАГНАЦЬ ЛІЧБЫ ТАВАРААБАРОТУ МОЖНА

Журналістам Бахтавар Сафарзада расказаў, што падчас сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі былі абмеркаваны амаль усе напрамкі двухбаковага супрацоўніцтва. «Рэспубліка Беларусь — адна з ключавых пазіцый у знешняй палітыцы Таджыкістана. Паміж нашымі краінамі існуюць дагаворы аб сяброўстве і стратэгічным партнёрстве. Сённяшняя сустрэча прайшла ў духу стратэгічнага партнёрства на ўзроўні палітычных, эканамічных, культурна-гуманітарных адносін», — сказаў ён.

Ключавым пытаннем, зразумела, стаў тавараабарот. «У 2023 годзе мы крыху зменшылі ў тавараабароце. Але ўсе планы і мерапрыемствы сведчаць аб тым, што ў 2024 годзе дагнаць і перагнаць лічбы тавараабароту, якія ў 2023 годзе мы крыху збавілі, можна», — заявіў пасол. Гэтаму будзе садзейнічаць шматфункцыянальны цэнтр, які плануецца адкрыць у Мінску. Мяркуецца, што гэты цэнтр будзе садзейнічаць каардынацыі бізнес-колаў Беларусі і Таджыкістана.

Пасол нагадаў, што з 2017 года ў Таджыкістане збіраецца беларуская сельскагаспадарчая тэхніка. Падобную кааперацыю ён назваў узорным прыкладам у двухбаковых адносінах. «Акрамя рынку Таджыкістана, гэта зборачная прадукцыя карыстаецца поспехам і ў суседніх дзяржавах», — звярнуў увагу кіраўнік дыпмісіі. Ён назваў гэта добрым прыкладам сумеснай кааперацыі.

Акцыя

# ФАКЕЛ ДАБРЫНІ

**У Беларусі завяршылася рэспубліканская акцыя «Ад усёй душы», якая была ініцыявана Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам і накіравана на аказанне дапамогі пажылым людзям, ветэранам, доўгажыхарам. У паўночным рэгіёне клопатам з боку кіраўніцтва вобласці, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і ўстаноў, маладога пакалення былі ахоплены тысячы людзей «залатога» ўзросту.**

Старт рэспубліканскай акцыі «Ад усёй душы» трэцяга студзеня далі мерапрыемствам, прысвечаным 105-годдзю з дня ўтварэння органаў па працы і сацабароне. У Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа сабраліся больш за 500 чалавек з усяго рэгіёна: прадстаўнікі старэйшага пакалення, удастоеныя ганаровых званняў, дзяржаўных узнагарод, ветэраны працы з усёй Віцебшчыны.

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН** адзначыў на адкрыцці мерапрыемства, што моладзь бярэ прыклад з людзей «залатога» ўзросту і імкнецца цягнуцца за імі, бо яны яшчэ поўныя сіл, энергіі, запалу і ідэй. «Прыцягненне моладзі да гэтага працэсу аб'ядноўвае грамадства і паказвае, што ў нас ёсць пераемнасць. Тут ёсць актыўныя людзі, якім 80, 70 гадоў. Яны яшчэ могуць і нас павучыць, падсілкаваць энергіяй. Падрастаючае пакаленне глядзіць на гэта і кажа: «Нічога сабе, так мы, можа, дзесьці і адстаем, мы ж маладзейшыя, мы павінны быць больш актыўнымі». І гэта ўсё як факел алімпійскі перадаецца з рук у рукі. І гэты валанцёрскі рух, рух дапамогі адно аднаму толькі набірае абароты», — выказаў сваё меркаванне кіраўнік вобласці.

Разам з прадстаўнікамі «залатога» ўзросту віншаванні адрасавалі тым, хто побач з імі па абавязку службы і закліку сэрца, — работнікам сістэмы сацыяльнай абароны вобласці. Напярэдадні прафесійнага свята і 105-й гадавіны ўтварэння сістэмы Мінпрацы дзясяткі добрасумленных прафесіяналаў атрымалі заслужаныя ўзнагароды.

У межах акцыі член Савета Рэспублікі Ірына Ляўковіч, а таксама начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі аблвыканкама, старшыня Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага саюза жанчын Марына Навіцкая наведалі Чашніцкі раён. У цэнтры ўвагі на гэты раз апынуліся прадстаўнікі старэйшага пакалення, якія апякуюцца Тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Порцыю ўвагі і падарункаў атрымалі таксама наведвальнікі аддзялення сацыяльнай рэабілітацыі, абілітацыі інвалідаў ТЦСАН. Як кажуць, дапамогі шмат не бывае, а душэўнага цяпла хопіць на ўсіх.

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** наведаў Глыбоцкі псіханеўралагічны дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў у рамках рэспубліканскай дабрачыннай акцыі. Спікер ніжняй палаты Парламента не першы раз заязджае ў вёску Петрунова, дзе разам жывуць 330 чалавек ва ўзросце ад 18 гадоў, старэйшаму пастаяльцу 88. Пасля візіту ў 2020 годзе дзякуючы падтрымцы Уладзіміра Паўлавіча праведзены бягучы рамонт фасада будынка і даху гаспадарчага блока. Гэтым разам дом-інтэрнат і Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Глыбоцкага раёна атрымалі ў падарунак ад Старшыні Палаты прадстаўнікоў і Віцебскага аблвыканкама сертыфікаты на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў.



Фота БелТА.

«Клопат пра людзей старэйшага пакалення — адзін з прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь. Акцыю разглядаем як магчымасць удзяліць больш увагі пажылым людзям, а нам, заканадаўцам, пагля дзець, што яшчэ трэба зрабіць для ўдасканалення заканадаўства, хоць ужо многае зроблена. Акцыя — гэта таксама магчымасць аддзячыць старэйшаму пакаленню за вялікі ўклад, які яно ўнесла ў будаўніцтва моцнага падмурка беларускай дзяржаўнасці», — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка.

Таксама акцыя «Ад усёй душы» прайшла на базе Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Першамайскага раёна горада Віцебска. Актывісты віцебскага філіяла Акадэміі сувязі сумесна з кіраўніцтвам Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь, кіраўнікамі прадпрыемстваў галіны сувязі Віцебскай вобласці павіншавалі наведвальнікаў цэнтра, валанцёры і творчы актыў падарылі пажылым людзям музычныя віншаванні. Пасля выступленняў з моладдзю сустрэўся і абмеркаваў актуальныя пытанні грамадскага і палітычнага жыцця міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін Шульган.

Прадстаўнікі абласнога аддзялення беларускай партыі «Белая Русь» сумесна з актывам унітарнага прадпрыемства «Віцебскаблгаз» павіншавалі з навагоднімі святамі старэйшае пакаленне Віцебскага дома-інтэрната для састарэлых і інвалідаў. У якасці падарункаў ганаровыя госці ўручылі арганізацыі грашовыя сертыфікаты — гэтыя сродкі ахвяраваны членамі грамадскіх арганізацый па ўласнай ініцыятыве з найлепшымі пажаданнямі. А яшчэ творчы калектыў газавікоў парадаваў гледачоў яркімі канцэртнымі нумарамі.

«Калядны баль» для пажылых людзей — наведвальнікаў аддзялення дзённага знаходжання Наваполацкага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва зладзіў валанцёрскі цэнтр Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай. Інтэрактыўная праграма, арганізаваная студэнтамі, адбылася ў рамках рэспубліканскай акцыі. Падарункам для гледачоў сталі венскі і павольны вальсы і іншыя танцавальныя нумары ў выкананні ўдзельнікаў танцавальнай студыі «Балансе» Наваполацкага ТЦСАН, а таксама святочны фуршэт. Творчыя нумары прадставілі студэнты ПДУ. Госці прынялі ўдзел у квізе «Бальны этыкет», вырабе ўпрыгожванняў для калядняй ёлкі, латарэі пажаданняў і прадказанняў.

Вялікі святочны марафон прымаў і Аршанскі дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў. Яго наведалі намеснік міністра інфармацыі Ігар Бузоўскі, старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама Барыс Яфрэмаў. Вядома, не з пустымі рукамі, а з цёплымі словамі і каштоўнымі падарункамі. Ад міністэрства інфармацыі пастаяльцы ўстановы атрымалі апарат для падрыхтоўкі кіслародных кактэйляў, ад аблвыканкама — грашовы сертыфікат на паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

# ДАЕХАЦЬ ДА КОЖНАГА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Звонку — звычайны белы аўтобус з мінімумам вокнаў, унутры — міні-амбулаторыя. Адзін з выездаў мабільнага комплексу — у аграгарадок Насавічы, што за 30 кіламетраў ад райцэнтра. Прыезду медыкаў мясцовыя чакалі ў памяшканні ФАПа. Некалькі хвілін патрабуецца кіроўцу, каб разгарнуць і падключыць генератар, ад якога запрацуюць разеткі электрапрыбораў, святло і ацяпленне, нават рукамыйнік з падагрэвам вады.




У спецыялізаваным аўто прадугледжаны некалькі функцыянальных зон. У першай — шафа для верхняга адзення і крэслы для перавозкі медперсаналу ў дарозе, якімі могуць скарыстацца пацыенты, пакуль чакаюць прыёму. Цэнтральная частка памяшкання — для медагляду і ўсіх неабходных даследаванняў. Тут жа ўладкавана і аптэка, паслугі якой вельмі папулярны ў вяскоўцаў. У трэцім адсеку — сумешчаныя гінекалагічная і працэдурная зоны з маніпуляцыйным сталом для забору аналізаў. Прадугледжаны і халадзільнік для захоўвання і транспарціроўкі біяматэрыялу і вакцын.

— У 10 раніцы — ужо на месцы. За дзень у медыцынскі комплекс цяпер у сярэднім звяртаецца ад 10 да 15 чалавек, — адзначае **памочнік урача агульнай практыкі Станіслаў ДУЛУБ.** — Праводжу дыспансерызацыю, вымяраю артэрыяльны, унутрывочны ціск, раблю агульны агляд і прызначаю абследаванне або лячэнне. У нас можна здаць агульны аналіз крыві і мачы, біяхімію. Калі будуць выяўлены адхіленні ад паказчыкаў нормы, то пацыенту абавязкова пра гэта паведамяць, патлумачаць, куды звярнуцца для прызначэння дадатковага абследавання. У любым выпадку даныя аглядаў пацыентаў і вынікі аналізаў перадаю ўчастковаму ўрачу ва ўрачэбную амбулаторыю ці ў раённую паліклініку.



Мабільны комплекс, перакананыя медыкі, вельмі вялікая дапамога для правядзення вакцынацыі на вёсцы.

— Мясцовыя жыхары вельмі рады нашаму прыезду, гэта таксама падтрымлівае нас у працы, — дадае памочнік урача агульнай практыкі.

Выязджае мабільны комплекс у раён штодня ў будні. Такім чынам, медыкі пабывалі ўжо ў дзевяці населеных пунктах. У прыярытэце вёскі, дзе няма фельчарска-акушэрскіх пунктаў ці часова адсутнічае медработнік.

Між тым з пачатку года на Гомельшчыне не даюць расслабляцца маразы. Не кожны вясковец змога дабрацца да ўрача ў Калінкавічы.

«Улетку і ўвосень на паездкі ў паліклініку няма часу з-за агародаў, а ўзімку не хочацца выбірацца ў паездку з-за холаду, і вірусаў баімся. Таму мы, вядома, вельмі рады перасоўнаму ФАПу... І апошнія сельскія навіны даведацца, і важныя медыцынскія пытанні вырашыць, тую ж кардыяграму зрабіць, унутрывочны ціск памераць, здаць аналізы... Дзякуй за гэта нашым медыкам!» — дзеліцца вяскоўцы. Кажуць, мабільны комплекс — меддапамога з дастаўкай да парога дома.

— Перасоўны фельчарска-акушэрскі пункт стаў вельмі важнай пакупкай для нашага раёна, — дзякуе ад свайго імя і ад імя сваіх калег **намеснік галоўнага ўрача Калінкавіцкай цэнтральнай раённай бальніцы Анастасія ЗМУШКА.**

Мабільны медыцынскі комплекс, набыты за сродкі абласнога бюджэту, дапамажа зрабіць аказанне меддапамогі на вёсцы больш даступным. Асабліва гэта важна для аддаленых ад райцэнтра населеных пунктаў.

— Калінкавіцкі раён наш уваходзіць у дзясятку самых буйных па плошчы ў краіне. Працягласць раёна — каля 90 кіламетраў. У нас 129 населеных пунктаў, многія з якіх знаходзяцца на значнай адлегласці адзін ад аднаго. На тэрыторыі абслугоўвання — 39 ФАПаў, дзве амбулаторыі ўрача агульнай практыкі, тры ўчастковыя бальніцы, дзе прадугледжаны месцы з сястрынскім доглядам і асобная бальніца сястрынскага догляду. У цэлым у нашым раёне абслугоўваюцца каля 17 тысяч сельскіх жыхароў, — расказвае аб зоне адказнасці медыцынскага звяна раёна Анастасія Мікалаеўна.

У гэтай мясцовасці ўжо была наладжана практыка выязных прыёмаў на базе ФАПаў урачоў агульнай практыкі, за якімі замацаваныя пэўныя сельскія ўчасткі. Цяпер, дзякуючы мабільнаму медыцынскаму комплексу, ёсць магчымасць пашырыць аб'ём дапамогі і яе якасць.

— Акрамя забору біяматэрыялу для аналізаў, агульнага агляду, вымярэння артэрыяльнага ціску, продажу лекаў, у комплексе, пры неабходнасці змогуць весці прыём урачы агульнай практыкі і гінеколаг, — звярнула ўвагу Анастасія Змушка. — Мы імкнёмся вызначыць і выпрацаваць аптымальны графік работы мабільнага комплексу для кожнай вёскі. Перыядычнасць выездаў устанаўліваем у залежнасці ад аддаленасці вёскі ад устаноў аховы здароўя. Першапачаткова мабільны комплекс выязджаў у вёскі, дзе няма фельчарска-акушэрскіх пунктаў, ці ў іх часова адсутнічае медработнік альбо адзін спецыяліст сумяшчае працу ў некалькіх населеных пунктах. Калі ў вёсцы ёсць ФАП, але, напрыклад, маецца таксама значная колькасць насельніцтва і ахвотных атрымаць меддапамогу, то зноў жа будзе задзейнічаны мабільны комплекс. Калі з-за праблем са здароўем хтосьці з пацыентаў не зможа самастойна дабрацца да таго месца ў вёсцы, дзе размясціўся мабільны комплекс, да гэтага чалавека змогуць пад'ехаць асобна.

Дарэчы, медыкам з райцэнтра падчас выездаў на вёску ў плане інфармавання людзей актыўна дапамагаюць як медыцынскія работнікі, якія абслугоўваюць сельскія населеныя пункты, так і старшыні сельсаветаў і памочнікі старшынь па тых ці іншых населеных пунктах. Сельсаветы дапамагаюць у тым ліку з расчысткай дарогі і пляцоўкі, дзе на вёсцы размяшчаецца мабільны комплекс.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота Калінкавіцкай ЦРБ.**

Надвор'е

# ЗНОЎ МОЦНЫ ВЕЦЕР, А Ў СЕРАДУ — ДА 18 МАРОЗУ

**На гэтым тыдні ў нас зноў будуць разгойдвацца «сінаптычныя арэлі», якія адрозніваюцца няўстойлівымі тэмпературнымі ваганнямі. А франтальныя раздзелы будуць прыносіць у краіну новыя порцыі ападкаў рознай фазы і інтэнсіўнасці, у асобныя дні дыскамфорту будзе дадаваць моцны парывісты вецер, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У аўторак на большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе снег, месцамі мяцеліца. На асобных участках дарог галалёдзіца. Ноччу па заходняй палове краіны, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра на працягу сутак будзе вагацца ад мінус 3 да мінус 8 градусаў.

Самым халодным днём на гэтым тыдні будзе серада. У гэтыя суткі ноччу месцамі прагназуецца невялікі снег, днём — пераважна без ападкаў. На асобных участках дарог галалёдзіца. Уначы месцамі на паўночным усходзе краіны чакаецца ўзмацненне ветру да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе 10—16 градусаў ніжэй за нуль, а пры праясненнях — да мінус 18 градусаў. Днём тэмпература будзе ў межах ад мінус 1 градуса па паўднёвым захадзе да мінус 10 градусаў па паўночным усходзе.

А ў чацвер чакаецца пагаршэнне ўмоў надвор'я. Тэрыторыя Беларусі апынецца ва ўладзе актыўных атмасферных франтоў, за якімі пачне паступаць цёплая марская паветраная маса.

Маразы будуць адступаць, а ападкі са снегу пярэйдуць у мокры снег, раніцай і днём з дажджом, што можа стаць прычынай утварэння галалёдных з'яў. Разам з тым ападкі будуць суправаджацца моцным парывістым ветрам, што паспрыяе ўзнікненню завей. Тэмпература паветра ўначы будзе ад мінус 2 градусаў па паўднёвым захадзе да мінус 15 градусаў па паўночным усходзе, а днём — ад мінус 3 да плюс 4 градусаў.

У ноч на Вадохрышча (у пятніцу) вецер аслабее, а ападкі працягнуць ісці на значнай частцы тэрыторыі. У асобных раёнах слабыя туман і галалёд. На дарогах месцамі галалёдзіца. Пры гэтым моцных маразоў чакаць не варта. Тэмпература паветра на працягу сутак будзе ад мінус 5 градусаў па паўночным захадзе да плюс 1 градуса па паўднёвым усходзе, а ўначы ў паўночна-заходніх раёнах пры праясненнях да мінус 8 градусаў.

Згодна з папярэднім прагнозам айчынных сіноптыкаў, у выхадныя дні зноў чакаецца зімовае надвор'е, тэмпературны фон панізіцца, а ападкі — у выглядзе снегу. Асобныя ўчасткі дарог будуць слізкія. У суботу-нядзелю месцамі пройдзе невялікі снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы апусціцца да мінус 5—12 градусаў, а пры праясненнях — да 13—17 марозу. Днём сіноптыкі абяцаюць 1—8 градусаў ніжэй за нуль.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Brexit абышоўся эканоміцы Вялікабрытаніі ў 140 мільярдаў фунтаў стэрлінгаў



З-за Brexit брытанская эканоміка недаатрымала 6 працэнтаў ВУП (амаль 140 мільярдаў фунтаў стэрлінгаў (178,7 млрд долараў). Пра гэта заявіў мэр Лондана Садзік Хан, паведаміла інфармагенцтва «Сіньхуа». Выхад краіны з Еўрапейскага саюза абышоўся эканоміцы брытанскай сталіцы больш чым у 30 мільярдаў фунтаў, адзначыў ён, выступаючы ў лонданскім Сіці. «Brexit — гэта зусім не другарадная праблема, якую мы можам пакінуць у мінулым, гэта ключавы фактар цяперашняга крызісу кошту жыцця, ён вядзе да страчаных магчымасцяў, страчанага бізнесу і страчанага даходу ў той час, калі людзі і кампаніі менш за ўсё могуць сабе гэта дазволіць», — падкрэсліў мэр. У 2023 годзе сярэднестатыстычны брытанец недаатрымаў з-за Brexit амаль 2000 фунтаў, а лонданец — амаль 3400 фунтаў.

### У Японіі пачалі будаўніцтва новай базы ЗША на Акінаве



У Японіі пачалося будаўніцтва новай ваеннай базы ЗША ў раёне горада Нага. Пра гэта паведаміла тэлерадыёкампанія NHK. Генеральны сакратар японскага ўрада Ёсімаса Хаясі заявіў, што работы зоймуць дзевяць гадоў і тры месяцы. Указваецца, што рашэнне прынята ў мэтах пераносу амерыканскай базы Футэма, якая знаходзіцца на гэтым жа востраве, размешчанай у густанаселеным горадзе Гінаван. Губернатар прэфектуры Акінава Дэні Тамакі, каменціруючы рашэнне аб пачатку будаўнічых работ, якія першапачаткова стартавалі ў 2017 годзе, а затым неаднаразова спыняліся і аднаўляліся, выказаў расчараванне. «Вельмі сумна, што ўрад дзейнічае зыходзячы са сваіх інтарэсаў», — заўважыў ён. Перанос амерыканскай базы Футэма, якая цяпер размешчана ў густанаселеным раёне Гінаван, з'яўляецца адным з найбольш вострых пытанняў у адносінах урада Японіі і ўладаў Акінавы, якія неаднаразова спрабавалі аспрэчыць у судзе рашэнне аб перадыслакацыі. На востраў Акінава прыпадае каля 75 працэнтаў плошчы ўсіх амерыканскіх ваенных аб'ектаў у Японіі, што выклікае незадаволенасць мясцовага насельніцтва. Базу ВМС ЗША Футэма мясцовыя ўлады называюць самай небяспечнай у свеце з-за яе размяшчэння прама ў цэнтры горада ў асяроддзі жылых дамоў і школ.

### У Эквадоры знойдзены старажытны горад — найбуйнейшы ў гісторыі раскопак у Амазоніі

У басейне ракі Амазонкі знойдзены вялізны старажытны горад, які тысячагоддзямі хаваўся за пышнай расліннасцю, паведаміла «ВВС». На думку вучоных, знаходка значна зменіць нашы ранейшыя ўяўленні аб людзях, якія засялялі гэты рэгіён. Горад размешчаны ў даліне Упана на ўсходзе Эквадора, які знаходзіцца ў цені вулкана. Па словах навукоўцаў, вялікі поспех, што вулкан не разбурыў жыллё супольнасцяў, якія жылі тут цягам многіх тысячагоддзяў. На аснове даследаванняў іншых старажытных селішчаў у горнай мясцовасці Паўднёвай Амерыкі раней лічылася, што гэтыя месцы засялялі качэўнікі. Усе яны, у тым ліку знакаміты Мачу-Пікчу ў Перу, будаваліся адносна невялікімі і простымі ў сэнсе гарадскога планавання. Адкрыццё ва Упана ўразіла вучоных складанай сеткай дарог і каналаў, якія злучалі гарадскія вуліцы і плошчы.

Зроблена ў Беларусі

# АД САЛАМЯНАГА ПАВУКА ДА ЛЬНЯНОГА АЛЕЮ

## Спрадвечныя айчынныя здабыткі стануць мясцовымі інтэлектуальнымі брэндамі

**Кіраўскія смажні, дрыбінскія шапкі і валёнкі, гальшанскія пернікі, ваўкавыскія вясельныя караваі, гарадоцкае ажурнае ткацтва, бярозаўскія шчэпавыя птушкі-абярэгі, палескія журавіны, лельчыцкае лясное бортніцтва, быхаўскія саламяныя павукі, карэліцкія льняныя вырабы і алей. Усе гэтыя і шмат якія іншыя адмысловыя айчынныя вырабы прэзентавалі на штогадовым міжнародным конкурсе «Адкрываючы свет інтэлектуальнай уласнасці — 2023», які быў прысвечаны народным промыслам. Прадстаўленыя прадукты могуць прэтэндаваць на набыццё свайго геаграфічнага ўказання, якое дазволіць ім атрымаць прававую ахову ў якасці аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці. Такім чынам будзе падкрэслена паходжанне тавару з тэрыторыі пэўнага геаграфічнага аб'екта, а назву населенага пункта ці мясцовасці, дзе вырабляецца самабытны прадукт, можна будзе выкарыстоўваць на ім, каб падкрэсліць тым самым яго асаблівыя ўласцівасці, якасць і рэпутацыю, перакананы арганізатары конкурсу.**

### Зарабляць на геаграфічных указаннях

Мерапрыемства, якое Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях (ДКНТ) ладзіць сумесна з Міністэрствам адукацыі, Нацыянальным цэнтрам інтэлектуальнай уласнасці і Еўразійскім патэнтным ведамствам Еўразійскай патэнтнай арганізацыі, пераследуе выхаваўчую і адукацыйную мэты, таму невыпадкова, што яго ўдзельнікі — моладзь ад 13 да 18 гадоў.

*— Гэта людзі, якія вось-вось увойдуць у наша грамадства як дарослыя, будуць ствараць свае сем'і. Вельмі важна, каб яны ведалі спадчыну нашай зямлі, тавары, якія ў нас вырабляюць,* — расказаў **Дзяніс КАРЖЫЦКІ, першы намеснік старшыні ДКНТ.** *— І гэта прадукцыя, якую фактычна стварылі нашы бацькі і дзяды, унікальная, яна дайшла да нас праз стагоддзі. Мы хочам, каб моладзь не проста ведала, што ў нас ёсць такая прадукцыя, а і ведалі, як яе папулярызаваць, каб пра яе даведаліся ва ўсім свеце. Удзельнікі конкурсу стварылі канцэпцыі прасоўвання айчыннай прадукцыі, даведваліся, як абараняць распрацоўкі, якія называюцца «геаграфічныя ўказанні», а таксама распрацоўвалі планы, як вытворцам прадукцыі прасоўвацца на замежныя рынкі.*

Хлопцы і дзяўчаты праслухалі цыкл лекцый, даведаліся пра нюансы абароны інтэлектуальнай уласнасці, што патрабуе ведання эканомікі, юрыспрудэнцыі, маркетынгу. Яны разабраліся, што такое брэнд, з чаго ён складаецца, як яго папулярызаваць і зрабіць вядомым, як зарабляць на гэтым грошы.

Паказаныя падчас конкурсу мастацкія промыслы, традыцыі ткацтва, сельскагаспадарчая прадукцыя, як спадзяюцца арганізатары, з часам могуць стаць не менш вядомымі, чым брэнды Мінскага трактарнага завода, БелАЗа, МАЗа.

*— Пераможцы ацэньваліся па спосабе прававой аховы геаграфічнага ўказання, методыцы прасоўвання прадукту (наколькі падрабязна прапрацаваны пытанні, звязаныя з выхадам на новыя рынкі), магчымасцях яго папулярызацыі і стварэння вядомасці,* — заўважыў намеснік старшыні. *— З 1300 канкурсантаў з Беларусі, Кыргызстана і Азербайджана пераможцамі ў большасці сталі ўдзельнікі з райцэнтраў, пасёлкаў, малых гарадоў. Гэта сведчанне таго, што моладзі цікава аўтэнтычнасць нашага этнасу.*

Выявіць аўтэнтычнасць прадукцыі народных промыслаў і непаўторнасць тэхналогій, створаных у нашай краіне, і было адной з задач канкурсантаў. Школьнікі самі выбіралі тавар, які будуць прасоўваць, і былі заахвочаны паказаць свету самабытную прадукцыю свайго мястэчка.



**Варвара КАЯК, вучаніца 11 «А» класа гімназіі № 4 г. Віцебска,** фіналістка 4-га этапу конкурсу, разам з паплечнікамі распрацоўвала канцэпцыю прасоўвання гарадоцкага ажурнага ткацтва — унікальнага народнага рамяства:

*— Мы збіралі інфармацыю з адкрытых крыніц, ездзілі ў Гарадок, каб узяць інтэрв'ю ў Марыны Гушчы, народнага майстра Беларусі, якая займаецца гэтым рамяством. Пасля ўжо распрацавалі камбінаваны таварны знак і назву геаграфічнага ўказання. Выбіралі тэрыторыю распаўсюджвання тавару і яго мэтавую аўдыторыю (калекцыянеры, аматары народнага рамяства, жанчыны, якія хочуць вылучацца знешне сярод іншых і паказаць беларускую моду). У працэсе было вельмі цікава пазнаваць, як ствараецца і выглядае гэтая прадукцыя, і паралельна мы шмат даведаліся і пра гісторыю сваіх мясцін.*

Геаграфічныя ўказанні не толькі прыцягваюць увагу да рэгіёна, вобласці ці краіны, дзе яны былі створаны, але і могуць стаць магутным інструментам для развіцця малога і сярэдняга бізнесу, прыцягнення інвестыцый, павышэння прывабнасці ўязнога турызму ў рэгіёнах і ў цэлым прасоўвання Беларусі на сусветнай арэне, перакананы ў ДКНТ.

### Палескія журавіны і гальшанскі пернік

Адзін з пераможцаў і прызёраў конкурсу — таварыства «Палескія журавіны». Гэта адна з найбуйнейшых у Еўропе плантацый журавін, якая змяшчаецца ў Пінскім раёне Беларусі. Арганізатары конкурсу адзначаюць, што ягада ўнікальная, бо расце ў непаўторных геаграфічных умовах па тэхналогіі, якую распрацавалі беларускія вучоныя.

*— Сёння «Палескія журавіны» — адзін з брэндаў Пінскага раёна. Вытворчасць сваю мы пачалі з 1985 года дзякуючы савецкім меліяратарам,* — падзяліўся **Васіль ЛЯГУСКІ, дырэктар таварыства «Палескія журавіны».** *— Выкарыстоўваем непрыдатныя землі, выпрацаваныя тарфянікі. Практычна палова школ раёна прыязджае да нас на ўборку ўраджаю, і такім чынам мы папулярызуем гэтую культуру. Са сваімі ягадамі даехалі ўжо ажно да Хабараўска. Аднак цяпер шмат хто пачынае займацца журавінамі, і наспела неабходнасць іх аховы як прадукту. Тэхналогіі па вырошчванні журавін стварылі палешукі, якія адаптавалі яе да ўмоў рэгіёна. Як кажуць, «хто такі паляшук — той, хто поле шукаў». Не знайшлі нармальнай зямлі — працуем на тарфяніках.*

Па ўраджайнасці гэта эканамічна выгадная культура, аднак яна патрабуе вялікіх матэрыяльных укладанняў (збудаваць дамбы, выраўняць зямлю, стварыць сажалкі). Таму распаўсюдзіць вырошчванне журавін на іншай тэрыторыі (акрамя 87 палескіх гектараў) затратна. Прадпрыемства не толькі пастаўляе свежыя ягады, але і вырабляе з іх цукаты, робіць сушаныя і вяленыя журавіны.

А вось па гальшанскія пернікі, якія, дарэчы, можна набыць толькі ў замку Гальшанскім, турысты, якія не купілі ласунак, але пакаштавалі ў сваіх суседзяў па аўтобусе, вяртаюцца. Пра гэтую страву нават ёсць легенда, расказала **Настасся НАВІЦКАЯ, дырэктар Ашмянскага краязнаўчага музея імя Багушэвіча:**

*— Калісьці Павел Стэфан Сапега, якому надакучылі заморскія стравы, запрасіў да сябе найлепшых кухараў і загадаў прыгатаваць тое, чаго ён яшчэ не каштаваў. Сын пекара, якому пакуль не давяралі рабіць такія важныя справы, таксама вырашыў паспрабаваць сябе. Ён спёк невялікі пернік, які зрабіў з цеста, што засталося ад гатавання стравы бацькам, дадаў туды прыправы, яйка, мёд і іншыя інгрэдыенты, што былі пад рукамі. І гэты пернік таксама паклалі на стол гаспадара замка. Калі Павел Стэфан Сапега пакаштаваў страву, яна яму так спадабалася, што ён загадаў гатаваць сабе такія пернікі штодня, а рэцэпт іх не выносіць за межы замка. З тых часоў нашчадкі сына кухара, якія жывуць у Гальшанах, захоўваюць старажытны рэцэпт і гатуюць па ім пернікі.*

Над унікальным рэцэптам сапраўды шмат працавалі, некалькі разоў змянялі яго, і ў ім няма «хіміі». За дзень-два ў сезон могуць рэалізаваць 200—300 пернікаў, дадала суразмоўца.

Геаграфічныя ўказанні, якія могуць з'явіцца ў розных айчынных прадуктаў, пэўным чынам з'яўляюцца і рэпутацыйным ды іміджавым аб'ектам інтэлектуальнай уласнасці, таму маюць вялікае значэнне для дзяржавы, падкрэслілі арганізатары. А для вытворцаў рэгістрацыя геаграфічнага ўказання стане дадатковай магчымасцю аховы прадукцыі на знешніх рынках ад падробак і нядобрасумленнай канкурэнцыі.

**Ірына СІДАРОК.**

---

# УДУМЛІВА І З АСАЛОДАЙ

**Дзецям малодшага школьнага ўзросту адрасаваны зборнік твораў беларускіх пісьменнікаў «Пачытаем пасля школы», які пабачыў свет у Выдавецкім доме «Звязда». Кніга выдадзена па заказе Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**




Пад адной вокладкай укладальнік Наталля Шчарбакова сабрала вершы і апавяданні Ядвігі Бяганскай («Цяжкая задача», «Сябры»), Эдзі Агняцвет («Хто пачынае дзень», «Параска і падказка»), Петруся Броўкі («Песня хлебу»), Артура Вольскага («Роднае слова»), Рыгора Ігнаценкі («Бабіна лета»), Барыса Сачанкі («Хлеб»). Усе апавяданні і вершы ўваходзяць у вучэбную праграму па прадмеце «Літаратурнае чытанне» для малодшай школы. Пра што ж расказваюць творы добра вядомых пісьменнікаў, кожны з якіх знаёмы чытачу не аднаго пакалення? Пра адказнасць і сяброўства, пра павагу да рабочых прафесій, пра тое, што значыць у жыцці чалавека родная мова.

Апавяданні і вершы можна чытаць самастойна, а калі яшчэ хтосьці толькі засвойвае літары, то яму, пэўна, з задавальненнем прачытаюць сімпатычна аформленую кніжачку бацькі, дзядуля альбо бабуля. Мастачка Святлана Стахоўская здолела намаляваць не проста ілюстрацыі, якія суправаджалі б мастацкія тэксты, а выбудавала святочны настрой, дапоўніла творчыя адкрыцці пісьменнікаў сваімі гаворкамі, шматзначнымі вобразамі, сваімі цёплымі і прыцягальнымі колерамі.

Напрыканцы хацелася б заўважыць і тое, што кніга «Пачытаем пасля школы» праз знаёмства з кожным сваім творам дадасць у жыццё юных чытачоў удумлівасці і разважлівасці, а яшчэ знаёмства з ёю прынясе хлопчыкам і дзяўчынкам сапраўдную асалоду.

**Сяргей ШЫЧКО.**

---

# Праходзіць конкурс «Мастацтва кнігі — 2024»

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь на пачатку новага года па традыцыі праводзіць Нацыянальны конкурс «Мастацтва кнігі». 63-ці па ліку, сёлета ён адбудзецца 18 — 19 студзеня 2024 года.**

Спрачацца паміж сабою будуць выданні беларускіх кніжных выдавецтваў у наступных намінацыях: «ЛІТ-фармат» (выданні літаратурна-мастацкага кірунку); «Сучасны падручнік» (выданні вучэбнага характару); «Фотапогляд» (фотаальбомы, фотакнігі); «Дзецям XXI стагоддзя» (кнігі для дзяцей і юнацтва); «АРТ-кніга» (выданні па выяўленчым мастацтве, факсімільныя, рэпрынтныя, бібліяфільскія выданні); «Навука і веды» (навуковыя, навукова-папулярныя, даведачныя і энцыклапедычныя выданні); «Духоўнасць» (выданні духоўна-асветніцкага кірунку). І самую адметную кнігу 2023 года адзначаць у намінацыі «Трыумф» — з уручэннем дыплома імя Ф. Скарыны і памятнага знака-сімвала «Вялікі залаты фаліянт».

У спецыяльных намінацыях будуць вызначаны наступныя тэматычныя прасторы: «За ўклад у захаванне гісторыка-культурнай спадчыны»; «Садружнасць» (сумесныя выдавецкія праекты); «У люстэрку часу» (кнігі, выдадзеныя па замове); «Беларусь памятае» (кнігі, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне).

У персанальнай намінацыі «Майстэрства» адзначаць найлепшага ілюстратара, найлепшага дызайнера кнігі, найлепшага фотамастака кнігі.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# УСЁ І АДРАЗУ

## Для тых, хто шануе якасць

Мультыбрэндавая падача айчынных тавараў пакупніку — адна з ключавых тэндэнцый апошніх гадоў. Аб гэтым не раз і летась, і пазалетась казала, у прыватнасці, кіраўніцтва галіны лёгкай прамысловасці.

— Адзін з новых кірункаў развіцця менавіта падачы нашых тавараў пакупніку — мультыбрэндавыя прасторы. Гэта, напрыклад, сетка «Да дому», дзе прадстаўлена прадукцыя мноства прадпрыемстваў краіны, аб'яднаная агульнай канцэпцыяй дамашняй утульнасці. Мультыбрэндавыя крамы пад сваёй маркай адкрываюць «Conte», «Світанак» — там яны рэалізуюць прадукцыю і іншых беларускіх прадпрыемстваў, — адзначыла ў інтэрв'ю «Звяздзе» намеснік старшыні канцэрна «Беллегпрам» Наталля Мурашка.



Тэндэнцыя актуальная і для іншых сфер — ад прадуктаў харчавання да мэблі. І «Першы нацыянальны гандлёвы дом» (133 гандлёвыя пляцоўкі: фірменныя крамы, кафэ, бытавыя аб'екты) — якраз маштабная рэалізацыя гэтай канцэпцыі. Гэтыя 133 гандлёвыя аб'екты размешчаны на трох паверхах, а каб у пакупніка «не разбегліся вочы», крамы згрупаваны па рэгіёнах: другі паверх (куды трапляеш з галоўнага ўвахода) — Віцебская і Магілёўская вобласці (і частка брэндаў Міншчыны), трэці — Брэст, Гродна, Гомель, першы (цокальны) паверх — ізноў жа, сталічная вобласць. 91 крама нехарчовых тавараў, 27 — тавараў харчовых, 5 кафэ і рэстаранаў і 10 аб'ектаў аказання паслуг. Каля ўвахода можна азнаёміцца як з падрабязным планам гандлёвага дома, так і з планам размяшчэння крам па кожным з рэгіёнаў.

Знаходзіцца «Першы» праз дарогу ад «Дана Мол», але канкурэнцыі не баіцца.

— «Дана Мол» нам не канкурэнт, — усміхаецца прадавец Юлія. — Ён прывабны ў першую чаргу для моладзі. Людзі больш дарослыя, умудроныя вопытам, упэўнена, прыйдуць да нас. Бо з вышыні пражытых гадоў вучышся шанаваць якасць. А беларуская прадукцыя і якасць — сінонімы.

Зрэшты, моладзі сярод наведвальнікаў новага ГЦ таксама дастаткова, прычым нават у 10 гадзін раніцы ў суботу (вырашыла прыехаць да адкрыцця ў надзеі, што больш шансаў будзе спаць даўжэй, — але памылілася).

— Сёння раніцай пакупнікоў няшмат, — адзначае суразмоўніца. — Вось у першыя дні пасля адкрыцця вельмі шмат людзей было. Прыходзілі сем'ямі, прыязджалі з рэгіёнаў, шмат расіян было, іншыя замежнікі. А цяпер працуем у звычайным рэжыме.

## Не бульбай адзінай

Калі вам здалося, што на фоне амаль сотні нехарчовых крам тры дзясяткі крам харчовых — гэта няшмат, то вы памыляецеся. Рознага роду ежа тут — на кожным кро-




ку. Не можаце вырашыць для сябе дылему, якая згушчонка вам бліжэй, рагачоўская ці глыбоцкая? Ідзіце ў «Першы нацыянальны гандлёвы дом»: варыянтаў згушчонкі ад абодвух знакамітых вытворцаў тут мноства, прычым з рознымі смакамі — некаторыя віды ў Мінску амаль не сустрэнеш. І калі вам цікавы асабісты параўнальны аналіз глазураваных сыркоў з розных не тое што абласцей, але нават раёнаў краіны — таксама заходзьце сюды. Ёсць магчымасць азнаёміцца, купіць пад адным дахам дзясятак (або некалькі дзясяткаў) сыркоў з усёй краіны, пакаштаваць і вырашыць для сябе гэтае пытанне.

А ў цэлым харчовы асартымент сапраўды шырокі і разнапланавы — арыентаваны на рознага пакупніка. Уражвае выбар паўфабрыкатаў — замарожаных варэнікаў, пельменяў, блінцоў і г. д. У тым ліку варыянты раней асабіста мной у мінскіх крамах не бачаныя. Ёсць выбар для тых, хто лічыць сябе адэптам правільнага харчавання — напрыклад, да іх паслуг асартымент крамы «Віцебскі экапрадукт», а таксама прадукты з малака А2 (першым гэта цяпер моднае малако ў 2021 годзе пачаў выпускаць Лунінецкі малочны завод. А1 і А2 — генетычныя варыянты бялку бэта-казеіну, і ў чым тут «фішка», «Звязда» неяк пісала)...




Чакана шмат у новым ГЦ кандытаркі — і ў павільёнах ад «Камунаркі», «Спартака», «Чырвонага харчавіка», і ў фірменных крамах вытворцаў маштабам паменш. У шырокім асартыменце — і алкагольныя напоі, у першую чаргу традыцыйныя для беларускай кухні. Шмат сыроў: ад мацарэлы да відаў з цвіллю або спецыямі. І, вядома, да паслуг пакупнікоў вялікі выбар мяса і мясных прадуктаў. Індычку з розных рэгіёнаў, напрыклад, можна і трэба параўноўваць, як і стэйкі з мармуровай ялавічыны — варыянты ёсць. Не кажучы ўжо пра курыцу, свініну і вырабы з іх — ад сардэлек да «пальцам пханых» каўбас. Ёсць у новым гандлёвым цэнтры вялікі фудкорт, але пакуль што «кафэшак» там няшмат. А на першым (цокальным) паверсе размяшчаецца кафэ беларускай кухні «Пан Жыта».

***Што здзівіла:*** у невялікай краме «Лясная хатка» Бялыніцкага лясгаса можна купіць тушонку з ласяціны, аленіны і нават мяса зубра. Каштуе ўсё задавальненне ў межах дзясяткі за стандартны слоік тушонкі. Можна, вядома, абурацца: маўляў, гэта ж сімвал краіны, да таго ж зубр — у Чырвонай кнізе. Але супрацоўнікі крамы запэўнілі, што ўсё ў рамках закона. І раз ужо шкоду віду далікатэс не нанёс, чаму б не пакаштаваць?

Дарэчы, у гэтай жа краме прадаюцца вельмі мілыя шкляныя падарункавыя слоічкі з самым розным мёдам. У сярэднім 4 рублі за 130 грамаў.

## «Хюгге» па-беларуску

Крамы мэблі і тавары для дома — яшчэ адзін найбуйнейшы кірунак, на які арыентаваны гандлёвы цэнтр. Наўрад ці так задумвалася першапачаткова, проста мэблю і інтэр'ерныя рэчы ў Беларусі вырабляе шмат буйных і невялікіх кампаній, вось «ухіл» і атрымаўся сам сабой. І па дызайнерскіх кірунках, і па фармаце мэблевыя крамы тут вельмі розныя. Ёсць, напрыклад, прасторы сеткавых крам «Амі-Мэбля», Black Red White, ёсць пляцоўкі буйных вытворцаў, ёсць шоўрумы інтэрнэт-крам — напрыклад, divan.by ці furman.by. А таксама корнеры невялікіх прыватных вытворчасцяў.



Тое ж датычыцца аздаблення і дызайну кватэры (дома), а таксама прадметаў інтэр'ера: фарматы розныя. Нараўне з «Керамінам», «Беларускімі шпалерамі», «Віцебскімі дыванамі» і г. д. тут працуе таксама мультыбрэндавая прастора «Да дому». Гэта, дарэчы, ужо трэцяя мінская крама «Да дому» (ёсць яна таксама ў «Дана Мол» і «Сталіцы»).

Шмат у новым ГЦ крышталю і фарфору, ёсць шэраг студый кухні, а таксама крамы садовай мэблі. Можна знайсці і ўвогуле дызайнерскія рэчы — тыя, што «ў адзіным экзэмпляры».

— Мы працуем не толькі для людзей, у якіх ёсць загарадны дом, — распавялі ў «Краме кавання» (вытворчасць размешчана ў Магілёве). — Чаму ў кватэры, каля ўваходу, скажам, трэба ставіць палічку з фанеры? Можна ж паставіць прыгожую і надзейную этажэрку — спалучэнне кавання і дрэва. Гэта ўкладанне на доўгія гады. Памятаеце, у савецкія гады быў такі анекдот: маўляў, мэблю ў нас робяць з фанеры, а платы — з якаснага дрэва. Дык вось, сёння гэта не так: мы, напрыклад, ствараем надзейныя, даўгавечныя, прыгожыя і якасныя інтэр'ерныя рэчы.

Дарэчы, вытанчаны каваны падсвечнік, навобмацак цяжкі, а па выглядзе — бязважкія карункі, тут можна набыць усяго за 42 рублі, хоць, вядома, на большасць пазіцый цана вышэйшая.

***Што здзівіла:*** аказваецца, у нашай краіне ёсць вытворчасці, якія робяць не толькі якасную і прыгожую класічную мэблю (мяккую і корпусную), але і дызайнерскую, у самых розных стылях. Знаходкай асабіста для мяне стаў брэнд Savlukov-Mebel. Па-першае і галоўнае, у сувязі са сваёй прадукцыяй: сапраўды стыльнай мяккай мэбляй, а па-другое, у сувязі з афармленнем шоўрума. «Раптам захацелася купіць канапу» — пагадзіцеся, гэта гучыць... мабыць, дзіўна: гэта ж не сукенка або сумачка, такую куплю звычайна людзі абдумваюць. Але мэбля тут выглядае так, што купіць яе менавіта «хочацца», узнікае такі імгненны імпульс. На шматлікіх канапах і крэслах красуецца таблічка «Прабачце, мяне ўжо купілі».

— Наша фабрыка — сучасная вытворчасць, якая знаходзіцца ў Віцебску, — распавядае прадавец. — У Мінску, як і ў іншых рэгіёнах Беларусі, нас пакуль не надта ведаюць, але, спадзяюся, хутка пазнаёмімся.

Знаёмства, здаецца, адбылося паспяхова. Дарэчы, дыяпазон цэн тут, у прынцыпе, не непад'ёмны. Ёсць зусім вартыя варыянты ад 2000 рублёў, хоць у асартыменце прыгажуні канапы і за 7-8 тысяч.

## Свой стыль

Па вопратцы і абутку, мабыць, варта было б зрабіць асобны агляд — іх тут таксама шмат, і калі вам цікавая мода, сумаваць у «Першым нацыянальным гандлёвым доме» не давядзецца. Як вядома, у Беларусі ёсць буйныя прадпрыемствы, якія забяспечваюць, скажам так, больш спакойны запыт (гэтае адзенне ў абсалютнай большасці, напрыклад, у ЦУМе і ГУМе) і лакальныя вытворчасці — дызайн-студыі, якія працуюць на стварэнне акцэнтных модных рэчаў. І тыя, і другія ў ГЦ прадстаўлены. Калі вас цікавіць другі варыянт, ідзіце ў тое крыло, дзе Брэсцкая і Гродзенская вобласці, там ёсць цікавыя корнеры — пакуль іх менш, чым хацелася б, але ж і цэнтр толькі адкрыўся. На сёння і тут пакуль пераважае той самы «спакойны запыт». Зрэшты, паказаць у новым ГЦ брэнды імкнуцца самае лепшае, так што і ў буйных вытворчасцяў тут можна знайсці нясумныя рэчы, якія захочацца купіць.

***Што здзівіла:*** дызайнерскае адзенне для дзяцей і падлеткаў. Аказваецца, яно ў нас шыецца — і шыецца няпрэнна. Напрыклад, у корнеры брэсцкага брэнда Colibri пакупнік апране сваю юную модніцу і для фэшнфотасесіі, і «на выхад», і на кожны дзень. Плюс аксесуары і ўпрыгожванні. Цэны тут, вядома, не сказаць каб бюджэтныя, але ж і рэчы дызайнерскія.

— Наша вытворчасць яшчэ маладая, ды і гандлёвы цэнтр новы, — распавядае прадавец. — Так што пакуль людзі прыходзяць больш «проста паглядзець», хоць ёсць ужо і продажы. Дарэчы, купляюць у нас не толькі для дзяцей, набываюць і дарослыя.



«Растоўка» ў брэнда да 170 см, так што вобразы могуць абраць сабе і дзяўчаты, і нават сталыя жанчыны (калі камплекцыя дазваляе).

І яшчэ аб плюсах. У шматлікіх корнерах дызайнерскага адзення ёсць разнапланавыя фотазоны (як і проста ў холах гандлёвага цэнтра), у шматлікіх крамах з прадуктамі — міні-кафэ. А ў цэлым мазаіка з розных айчынных вытворчасцяў сапраўды склалася ў прывабную і годную карціну, якую цікава разглядаць.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению коммунального дочернего унитарного предприятия «Кинотехпром» (продавец) в лице председателя ликвидационной комиссии Саковича В.П. извещает о проведении 29 января 2024 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 60 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20 каб. 2.9

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** затраты по переоформлению документов на переход права собственности возлагаются на Покупателя | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-81185** общей площадью **3 264,4** кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-хозяйственное. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10.<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-167549** общей площадью **7,7** кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-хозяйственное (проходная). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10/2.<br>**Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000002006414,** общая площадь **0,2036 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10.<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-190188** общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – **водопроводная сеть. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, водопроводная сеть от ВК1 до зданий по ул. Федюнинского, 10. **Информация о земельном участке:** 340100000002006040 (присвоен предварительно).<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-167548** общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – **тепловая сеть. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, тепловая сеть, от ТК-1 до здания по ул. Федюнинского, 10. **Информация о земельном участке:** 340100000002005572 (присвоен предварительно).<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-190467** общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **дождевая канализационная сеть. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, дождевая канализационная сеть по ул. Федюнинского, 10. **Информация о земельном участке:** 340100000002006043(присвоен предварительно).<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-190187**, общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – **сеть канализации. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, канализационная сеть от КК1 до КК7 по ул. Федюнинского, 10.<br>**Информация о земельном участке:** 340100000002006039 (присвоен предварительно). **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000002006412,** общая площадь **0,1070 га (право постоянного пользования, доля в праве – 33/50). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10.<br>**Также в состав лота № 1 входит:** сооружение – забор железобетонный (литер в, протяженность 52,8 м.п.). Сооружение – забор железобетонный (литер и, протяженность 53,92 п. м). Сооружение – забор металлический (литер б, протяженность 13,1 п. м). Сооружение – ворота металлические с электроприводом (литер г, протяженность 8,9 п. м, инв. № 255). Сооружение – ворота (литер д, протяженность 5,69 п. м, инв. № 01361030). Сооружение – тротуар (литер ж, площадью 31 кв. м, инв. № 01361033). Сооружение – бордюры (литер к, протяженность 57,52 п. м, инв. № 01361034). Сооружение – часть дворового покрытия, инв. № 01361031 (площадью 1 124,0 кв. м). Обдирочно-заточной станок 3Б632, инв. № н/д. Лифт грузовой без проводника, г/п 1000 кг, зав. № 3508, 1979 года выпуска, инв. № н/д. Трансформатор трехфазный, зав. № 8657, тип ТМФ-250/10-75У1, мощность 250 кВА, напряжение 10/0,4 кВ, частота 50 Гц, масса 1300 кг, охлаждение – масляное, дата выпуска – 1984 г., дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1984 г., инв. № н/д. Трансформатор трехфазный, зав. № 81666, тип ТМ-250/10-75У1, мощность 250 кВА, напряжение 10/0,4 кВ, частота 50 Гц, масса 1420 кг, охлаждение – масляное, дата выпуска – 1972 г., дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1984 г., инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 1, размер 4,2х2,2х0,6 м, количество полок – 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 2, размер 4,2х2,2х0,6 м, количество полок – 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 3, размер 4,4х2,4х0,6 м, количество полок – 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 4, размер 4,8х2,4х0,6 м, количество полок – 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 5, размер 4,8х2,4х0,6 м, количество полок – 6, инв. № н/д. Стеллаж комбинированный металлический № 6, размер 4,8х2,4х0,6 м, количество полок – 6, инв. № н/д. Забор металлический (в разобранном виде) (литер а, протяженность 32,66 п. м, инв. № 01361028), расчетная масса металла – 136 кг | 747 590,40 | 74 759,04 |

**Продавец:** Коммунальное дочернее унитарное предприятие «Кинотехпром», 246007, г. Гомель, ул. Федюнинского, д. 10.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: **8 (029) 647-81-95, Сакович Вадим Павлович.**

**Шаг аукционных торгов** – 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 16 января 2024 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 25 января 2024 г. в 16.00 включительно.**

**Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **15 (пятнадцати) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 27.07.2023 г. № 143 (30023).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению **ОАО «Литвяны-Агро»** (продавец) проводит повторный открытый аукцион

## ПО ПРОДАЖЕ БАНИ

**с инв. № 623/С-60963 общей площадью 192 м², расположенной на земельном участке с кадастровым номером 625684206001000265 площадью 0,1328 га (право аренды по 2072 г.), по адресу: Минская область, Узденский район, аг. Литвяны, ул. Школьная, 8Е.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 9 225,60** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 922,00** бел. руб.
Стоимость снижена на 50 %.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звезда» 31.08.2023, 10.11.2023.

Аукцион состоится **31.01.2024** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30.01.2024** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: (8029) 882-76-94, (801718) 60-3-72, 60-3-82.**

УНП 600002346

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению **ОАО «Мирополье»** (продавец) проводит открытый аукцион по продаже

## КАРТОФЕЛЕХРАНИЛИЩА

**с инвентарным номером № 610/С-65130 общей площадью 680,7 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 620887400001000848 (право аренды по 16.07.2073) площадью 0,2200 га по адресу: Минская область, Борисовский район, Пригородный с/с, 40, вблизи д. Бытча.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрической сети, пл. 0,0005 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 30 272,94** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 3 027,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330 000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **19.02.2024** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16.02.2024** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: 8 (01777) 9-13-01, 8 (044) 555-25-91.**

УНН 600134365

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора, директора ООО «Правовая Стратегия» (220136, г. Минск, а/я 330) проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества КТУП «Солигорский горплодоовощторг» (223710, Минская область, г. Солигорск, ул. Набережная, 16) в составе:

**Лот № 1:**

• **здание контрольно-пропускного пункта,** инв. № 644/С-59708, общей площадью 11,3 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625085400001002830 площадью 0,0493 га (право постоянного пользования, расположен в охранной зоне электрических сетей и придорожной полосе автомобильной дороги) по адресу: Минская область, Солигорский район, Чижевичский с/с, 39А, Любанское шоссе;

• **картофелехранилище,** инв. № 644/С-38132, общей площадью 3638,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625085400001002831 площадью 1,3742 га (право постоянного пользования, расположен в охранной зоне электрических сетей и придорожной полосе автомобильной дороги) по адресу: Минская область, Солигорский район, Чижевичский с/с, 39Б, Любанское шоссе;

• **трансформаторная подстанция,** инв. № 644/С-61856, общей площадью 51,1 кв. м, расположенная на земельном участке с кадастровым номером 625085400001002831 площадью 1,3742 га (право постоянного пользования, расположен в охранной зоне электрических сетей и придорожной полосе автомобильной дороги) по адресу: Минская область, Солигорский район, Чижевичский с/с, 39Б, Любанское шоссе.

Начальная цена с НДС – **754 680,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – **75 468,00** бел. руб.

**Лот № 2: фруктохранилище,** инв. № 644/С-38123, общей площадью 1343,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625000000012001704 площадью 0,9371 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, Солигорский район, Чижевичский с/с, 39, Любанское шоссе.

Начальная цена с НДС – **234 000,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – **23 400,00** бел. руб.

**Лот № 3: здание нежилое,** инв. № 644/С-59707, общей площадью 31,2 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625085400001002832 площадью 0,0226 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, Солигорский район, Чижевичский с/с, 39В.

Начальная цена с НДС – **3 240,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – **324,00** бел. руб.

*Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».*

Шаг аукциона – 5 процентов.

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ о внесении суммы задатка на р/с, указанный в извещении, с отметкой банка, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: юр. лицом РБ – копии устава со штампом о проведении гос. регистрации, свидетельства о гос. регистрации и их подлинники для заверения копий, доверенность представителю юр. лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юр. лица; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юр. лица или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; индивидуальным предпринимателем РБ – копия свидетельства о гос. регистрации и подлинник для заверения копии; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного физ. лица, индивидуального предпринимателя – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в торгах физ. лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физ. лица, индивидуального предпринимателя, юр. лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность.

К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов соглашение.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника предмет торгов продается ему по начальной цене, увеличенной на 5 %.

В день проведения торгов победитель торгов (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) подписывает протокол о результатах торгов.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель).

Аукцион состоится **19.02.2024 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16.02.2024** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11, телефон для осмотра (8029) 335 74 49.**

УНП 600122835

# ФІЛЬМ «АВАТАР» — УЖО НЕ ФАНТАСТЫКА

## Ці сапраўды планеце пагражае дэмаграфічны калапс, і каму гэта патрэбна?

**На самым пачатку года ва ўсім свеце абмяркоўвалі заяву аднаго з самых уплывовых і багатых людзей на планеце Ілана Маска. Ён даволі-такі безапеляцыйна заявіў на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы, што найбольшая сусветная небяспека на сёння — дэмаграфічны калапс. Трэба заўважыць, што падобныя заявы ад Маска гучаць не ўпершыню, тое самае («Планеце пагражае не дэмаграфічны крызіс, а калапс») ён заявіў пяць гадоў назад на міжнародным форуме ў Кітаі... Калі такія людзі штосьці публічна гавораць або пішуць, значыць, яны нешта ведаюць або маюць на ўвазе, падобныя заявы толькі дзеля хайпу ніхто з іх не робіць.**
**Дык можа, і праўда ўсё ідзе да дэфіцыту на Зямлі... людзей? Калі гэта так, каму гэта патрэбна і як ад гэтага ратавацца?**
**Аб гэтым мы паразважалі з доктарам палітычных навук, прафесарам кафедры палітычнай тэорыі МДІМА МЗС Расіі Кірылам КОКТЫШАМ.**


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**«Сённяшняя адміністрацыя ЗША ставіць задачы тактычныя, а не стратэгічныя. Тактычныя задачы — запаланіць краіну мігрантамі, каб забяспечыць дамінаванне лаяльных сабе выбаршчыкаў. Якая будзе за гэта стратэгічная расплата — аб гэтым сёння не думаюць, пра гэта будуць думаць заўтра, пасля выбараў. А наступствы могуць быць катастрафічныя, найперш для саміх ЗША, і здарыцца гэта можа даволі хутка, думаю, у бліжэйшыя гадоў пяць-шэсць мы гэта ўбачым».**

***— Кірыл Яўгенавіч, яшчэ гадоў дзесяць таму гаварылі аб перанаселенні планеты, цяпер Маск заяўляе аб дэмаграфічным калапсе як аб самай вялікай небяспецы. Але, калі глядзець на статыстыку ААН, быццам бы з колькасцю насельніцтва ў чалавецтва пакуль усё ў парадку: у лістападзе 2022 года яна перадолела мяжу 8 млрд чалавек. Па даных ААН, павелічэнне насельніцтва планеты на 1 млрд адбылося за 12 гадоў. Адзнакі 8,5 млрд чалавецтва, паводле прагнозаў, дасягне да 2030 года, а ў 2080-м людзей ужо будзе амаль 10,5 млрд. Але за Маскам паўтараюць і іншыя эксперты, нават з Кітая. Справа, атрымліваецца, не ў агульнай колькасці людзей, а ў дысбалансе на планеце, па прынцыпе «дзесьці густа, дзесьці пуста»?***

— На самай справе так, бо пытанне ж не толькі ў колькасці, але і ў якасці. Дэмаграфічны рост, як правіла, прыходзіцца на найменш развітыя рэгіёны, і ён у гэтым плане не гарантуе якасць чалавецтва. А ў рэгіёнах развітых ідзе трэнд на паніжэнне адукацыйных стандартаў, культурных стандартаў, спрашчэнне самога чалавека, ператварэнне яго ў «кіберчалавека» — што мы бачым на Захадзе ўжо гадоў 20—30. Усе гэтыя тэндэнцыі разбуральныя і насамрэч нічым іншым не кампенсуюцца. Сёння на значнай частцы планеты «брыльянтавы мільён» і «залаты мільярд» кіруюць усім астатнім людзі — гэта тыя, хто іх абслугоўвае, або тыя, што сыходзяць у віртуальную рэальнасць і ў ёй жывуць. Стала рэчаіснасцю тая мадэль, пра якую пісаў у «Машыне часу» Герберт Уэлс і якую пазней у больш удасканаленым выглядзе паказаў Дэвід Кэмеран у фільме «Аватар». Калі хочаш нешта даведацца — не трэба займацца адукацыяй, трэба проста падключыцца да «дрэва». Так вельмі лёгка, напрыклад, перапісаць гісторыю. І гэта перапісванне будзе тым больш эфектыўным, чым меншы будзе адукацыйны ўзровень спажыўца інфармацыі. Гэты трэнд на кіберчалавека — самы небяспечны, бо ён разам з усім астатнім мае на ўвазе дэградацыю самога чалавецтва. Вытокі ўзяцця курсу на гэты трэнд — даклад Рымскага клуба «Межы росту», апублікаваны ў 1972 годзе, у якім было дастаткова шчыра дэкларавана, што любая сапраўдная інавацыя мяняе баланс сіл, тым самым змяняючы і склад пануючага класа, калі не ўвесь клас. З гэтага вынікае, што, каб «спыніць цудоўнае імгненне», захаваць свой статус, гаспадарам свету інавацый больш не патрэбны: яны небяспечныя. Няхай замест іх будзе імітацыя інавацый! Памятаеце рэкламную формулу — «цяпер у новым пачку»? Якасць прадукту застаецца той жа, але ён цяпер нібыта новы і нават больш цікавы. Гэта не што іншае, як спроба спыніць развіццё чалавецтва. Дзеля чаго? Дзеля кансервацыі ўладнага становішча глабальных эліт — калі сёння 1 працэнт самых багатых людзей Зямлі маюць больш, чым 99 працэнтаў астатняга насельніцтва планеты.

***— У прынцыпе, няма нічога новага: статыстыка паказвае, што цэрпяць найперш краіны з высокім узроўнем развіцця. Хтосьці скажа, што гісторыя развіваецца па спіралі — рана ці позна самая развітая цывілізацыя прыходзіць у заняпад, а то і гіне зусім...***

— Самыя развітыя цывілізацыі не абавязкова прыходзяць у заняпад. Ёсць такое паняцце, як сума здзейсненых памылак, якія ў кожнай цывілізацыі назапашваюцца, і гэта ўрэшце можа прывесці да яе падзення. Але ёсць цывілізацыі, якія праз гэта досыць паспяхова прайшлі, — Персія, Індыя, Кітай, якія і сёння існуюць як непарыўныя культуры. Калі ў Кітаі ці Індыі адукаванага чалавека спытаць, што было на гэтым месцы паўтары тысячы гадоў назад, ён з вялікай верагоднасцю вам адкажа... Так што заняпад цывілізацыі залежыць найперш ад унутраных прычын, ад ужо згаданай сумы памылак, калі цывілізацыя іх не выпраўляе і на іх не вучыцца. Няма такой прадвызначанасці — што вось, цывілізацыя дасягнула нейкай корпкі ў развіцці і яе непазбежна чакае заняпад.

***— Нельга не заўважыць, што да гэтай самай кропкі сёння як ніколі некаторыя краіны імкнуцца самі, калі мець на ўвазе тэму нашай размовы — дэмаграфію. Прапаганда нетрадыцыйных адносін, бяздзетных сем'яў вялася і вядзецца, можна сказаць, нават агрэсіўна. Ёсць жа ў гэтага выгадаатрымальнікі?***

— Выгадаатрымальнікі, на самай справе, былі заўсёды. Вядомы італьянскі даследчык Марка Піцуці высветліў цікавы і, здаецца, сапраўдны матыў, чаму Брут апынуўся сярод забойцаў Цэзара. Справа ў тым, што незадоўга да таго Цэзар забараніў высокія працэнты на пазыкі, а Брут толькі-толькі здолеў навязаць аднаму невялікаму гораду імперыі пазыку пад «усяго толькі» 48 працэнтаў у месяц... Сітуацыя, калі капітал дзейнічае ў цені гучных ды прыгожых словаў дзеля сваёй выгады зусім не новая, яна старая як свет. Так, апошнія пяцьсот гадоў можна казаць аб існаванні «глыбіннай дзяржавы», што з'явілася на свет у выніку рэформаў Генрыха VIII, але і да таго можна знайсці шмат сюжэтаў, калі капітал, яшчэ не арганізаваны ў палітычную форму, імкнуўся знайсці і знаходзіў найбольш выгадны спосаб існавання для сябе. Гэта было ад таго часу, як капітал з'явіўся як паняцце, і здаралася кожны раз, калі не было этычных абмежаванняў адносна сродкаў атрымання найбольшай выгоды. Нагадаю, у Брытаніі сярэдзіны XIX стагоддзя опіумная вайна з Кітаем падавалася як «адкрыццё яшчэ адной дэспатыі дабротам свабоднага гандлю». Таварам быў опіум.

Што датычыцца прадстаўнікоў тых жа сексуальных меншасцяў, то гэта няшчасныя людзі, чые слабасці няшчадна эксплуатуюцца, а яны самі далёка не заўсёды разумеюць, што іх выкарыстоўваюць. Пратэстанцкі капіталізм, а англасаксы — гэта пратэстанты, прадугледжвае рост попыту толькі за кошт індывідуальнага спажыўца, пашырэння яго патрэб. А за кошт чаго можна гэтыя патрэбы максімізаваць? З пункту гледжання кейнсіянства, дзе галоўная праблема — гэта як зрабіць, каб грошы былі ў абароце, а не ў скарбонцы, прадстаўнік сексуальнай меншасці — ідэальны спажывец: у яго няма дзяцей, якія патрабуюць зберажэнняў ды выдаткаў, ён можа дазволіць сабе траціць столькі, колькі атрымлівае, а гэта значыць, што яго спажывецкія стандарты будуць вышэйшымі за сярэдні ўзровень. Вось вам і яшчэ адзін сегмент рынку, які сябе акупіць. У гэтым, дарэчы, няма нічога новага: тое, што адбываецца сёння з ЛГБТ і з трансгендарамі, вельмі нагадвае разгул сафістаў у Старажытнай Грэцыі — тыя ж аргументацыя, тыя ж базавыя ўстаноўкі. Якую задачу рашалі сафісты? Як вызваліць купца ад нейкіх маральных абавязкаў і абмежаванняў, каб ён дбаў пра асабісты прыбытак, атрымліваючы яго любой цаной і без пакут ад згрызот сумлення — апошняе было істотным, калі мы нагадаем, што самым прыбытковым таварам былі людзі, уцягнутыя ў рабства. І ўсё тое, што маем сёння, — і культура адмены, і культура астракізму, і нават пэўныя крытэрыі прыгажосці, калі лічылася, што ідэалам мужчынскай прыгажосці быў мужчына, падобны на жанчыну, і наадварот, — ужо было перажыта Старажытнай Грэцыяй падчас панавання сафістаў, якія стварылі цэлую індустрыю ў тагачасным разуменні.

Дарэчы, ЛГБТ — гэта ўжо ўчарашні дзень, у плане атрымання прыбытку з'явілася новая, куды больш выгадная катэгорыя, — трансгендары. Чалавек, які змяніў пол, пажыццёва вымушаны прымаць дарагія фармпрэпараты, гэта нават не залатая жыла для гігантаў фармакалогіі, а жывы залаты струмень, гэта ж бізнес, нават больш выгадны, чым наркотыкі.

***— Але ж калі так пойдзе далей, не будзе каму вырабляць тое, што так выгадна прадаецца?***

— Вось тут «залаты мільярд», а асабліва — «брыльянтавы мільён» — лічаць, што прагрэс будзе здольны вырашыць для іх праблему. Што рабатызацыя вытворчасці, штучны інтэлект і гэтак далей прывядуць да выніку, калі машыны заменяць значную частку «незалатых» мільярдаў», патрэбныя толькі ў якасці персаналу для абслугоўвання. Для гэтых людзей больш насельніцтва на планеце, чым ёсць, не трэба, нават тое, што ёсць, ужо зашмат.

***— Маск сказаў, што нават масавая міграцыя не ўратуе тую ж Еўропу ад калапсу. Але, на маю думку, тут іншая небяспека: можа перапісацца культурны код еўрапейцаў, і нашы ўнукі будуць жыць у зусім іншым свеце...***

— Еўропа і так усю сваю гісторыю перапісвала свой культурны код, гэта звычайны еўрапейскі лёс. Ён не тыповы для нас, для ўсходніх славянаў, а для Заходняй Еўропы — гэта звычайная справа...

***— Што дзіўна: ЗША, якія выглядаюць галоўным выгадаатрымальнікам у тым ліку і ў гэтай сітуацыі, пра дэмаграфічную праблему не гавораць. Атрымліваецца, яны, як заўсёды ў апошні час, застануцца «ў шакаладзе»?***

— Не, проста на сёння пра гэта ніхто не думае. Сённяшняя адміністрацыя ЗША ставіць задачы тактычныя, а не стратэгічныя. Тактычныя задачы — запаланіць краіну мігрантамі, каб забяспечыць дамінаванне лаяльных сабе выбаршчыкаў. Якая будзе за гэта стратэгічная расплата — аб гэтым сёння не думаюць, пра гэта будуць думаць заўтра, пасля выбараў. А наступствы могуць быць катастрафічныя, найперш для саміх ЗША, і здарыцца гэта можа даволі хутка, думаю, у бліжэйшыя гадоў пяць-шэсць мы гэта ўбачым.

***— Атрымліваецца, што многія народы ў той жа Еўропе могуць проста знікнуць з Зямлі, прычым таксама даволі хутка?***

— Здольнасць краін Еўропы да самазахавання залежыць ад ступені іх суб'ектнасці. Ад таго, наколькі яны гатовы ўсведамляць уласныя інтарэсы, а не знешнія. Сёння ў большасці еўрапейскіх дзяржаў ва ўладзе знаходзяцца падкантрольныя ЗША нават не эліты, а персоны, якія — хто пад пугай, пад цяжарам кампрамату, хто — за пернік, за ўласную будучыню — клапоцяцца аб інтарэсах ЗША, а не ўласных краін. Амерыканскія інтарэсы сёння — у захопе еўрапейскай прамысловасці і ўвогуле эканомікі, яна стала сродкам выжывання іх уласнай. І гэты працэс будзе ісці, пакуль эліты ў Еўропе не зменяцца. Вядома, Еўропа можа прачнуцца і ўзбунтавацца. Але пытанне, калі гэта будзе, калі будзе. Здаецца, не вельмі хутка.

***— І тады ўжо не будзе каму прачынацца...***

— Магчыма. Такі варыянт таксама не выключаны. Тут усё залежыць ад самой Еўропы...

***— Ці можа асобна ўзятая дзяржава абараніць сябе ад такіх тэндэнцый? Сацыяльная палітыка — так. Але, як паказвае досвед той жа Еўропы, дзе высокія дзіцячыя дапамогі і льготы для шматдзетных, а нараджальнасць не павялічваецца, адной сацыяльнай палітыкі мала...***

— Асобна ўзятая краіна — не. Тут істотныя саюзы і альянсы, у якіх яна знаходзіцца, бо насамрэч незалежнасць у сённяшнім складаным свеце гарантуецца толькі ўзаемазалежнасцю. Калі краіна знаходзіцца ў правільнай кампаніі, яна выжыве, менавіта як суверэнная дзяржава. Калі ёсць агульныя каштоўнасці, тады ёсць і калектыўная моц адстойваць сваё, бо ў адзіночку не выжыве ніхто, і ў гэтым таксама няма нічога новага. Або ты сябруеш з аднадумцамі, якія цябе падтрымліваюць, або, калі такіх аднадумцаў няма, у цябе надыходзяць цяжкія часы... Глабальнай эканоміцы можа супрацьстаяць толькі глабальная эканоміка, што сёння мы і назіраем: намецілася раздзяленне свету, а значыць, і сусветнай эканомікі, на заходнюю меншасць і незаходнюю большасць. Калі мы кажам пра гэта, мы маем на ўвазе і рэгіянальнае раздзяленне працы, якое забяспечвае таннасць прадукцыі, што вырабляецца. А выбудаваць сістэму раздзялення працы заўсёды лягчэй у рэжыме ўзаемадзеяння.

***— Калі ўсё ж здарыцца абяцаны Маскам калапс, у беларусаў ёсць шанцы выжыць?***

— А чаму ў нас здарыцца калапс? Беларусь, беларуская эканоміка развіваецца ў рамках Саюзнай дзяржавы, беларуская прамысловасць сёння стала другім сэрцам гэтага аб'яднання. Гэта бліскучыя перспектывы развіцця. Беларусь хутка стане членам ШАС, Беларусь збліжаецца з БРІКС — а гэта вельмі сур'ёзна, гэта мае на ўвазе раўнапраўны ўдзел у абмеркаванні карціны свету з галоўнымі глабальнымі гульцамі, якія, у адрозненне ад заходніх краін, маюць у прыярытэце ўласную суб'ектнасць, шануюць інтарэсы і каштоўнасці сваіх народаў. Беларусь у гэтым плане знаходзіцца ў правільнай кампаніі.

**Гутарыла Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

# ЗНІЖАЮЦЬ ЦІСК І ХАЛЕСТЭРЫН, ПАВЫШАЮЦЬ ПРАЦАЗДОЛЬНАСЦЬ І ІМУНІТЭТ



## Карысць ад ужывання буракоў нашмат большая, чым меркавалі раней

**Буракі для вінегрэту, баршчу і селядца пад футрам з'яўляюцца незаменнымі. А яшчэ гэта вельмі карысная агародніна. Яна змяшчае бор, марганец, жалеза, дапамагае крывятварэнню, паляпшае работу кішэчніка. Буракі карысныя для добрай работы печані. Гэты караняплод часта рэкамендуюць тым, хто імкнецца пахудзець ці проста зрабіць сваё харчаванне больш здаровым, бо пры ўсёй карысці каларыйнасць сырога бурака невысокая: 40 ккал на 100 г прадукту.**
**Што нядаўна высветлілі навукоўцы пра буракі? Чаму менавіта гэтаму караняплоду ставяць у заслугу медалі брытанскіх алімпійцаў? Як правільна гатаваць буракі і чаму самым карысным з'яўляецца іх сок? Пра гэта расказвае нейрахірург, навуковы супрацоўнік аддзялення пухлін галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчык кафедры неўралогіі і нейрахірургіі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Гумен ГУРБАНІДЖАД.**

***— Доктар Гумен, чаму буракі так добра прыжыліся ў славянскай кухні?***

— Кожная кухня мае пэўныя мясцовыя асаблівасці. Японская ўключае шмат рыбы, у міжземнаморскай багата арэхаў і чырвонага віна. Гэта звязана з той колькасцю вітамінаў, мінералаў, бялкоў, вугляводаў, якую людзі гэтай мясцовасці павінны атрымліваць. Напрыклад, народы крайняй поўначы (чукчы ці эскімосы) ядуць свежазамарожаную рыбу без тэрмічнай апрацоўкі, бо там не расце зеляніна. І каб забяспечыць дастатковую колькасць вітамінаў і мінералаў, неабходна есці сырую рыбу.

На нашай тэрыторыі клімат мяняецца, робіцца больш цёплы. Але раней былі суровыя зімы. Пры гэтым адсутнічала свежая зеляніна, агародніна і садавіна, таму з'явіліся свае асаблівасці харчавання, каб у зімовы час забяспечыць арганізм вітамінамі, асабліва вітамінам С. Тую агародніну, якую маглі, захоўвалі на зіму, — капусту, моркву, буракі. Напрыклад, квасілі капусту. Яна не толькі ўтрымлівае мінералы і вітамін С, але і працуе як добры прабіётык.

Цяпер гэтай праблемы няма, у XXI стагоддзі наладжана лагістыка, круглы год мы маем доступ да свежай гародніны, фруктаў, зеляніны.

Аднак буракі занялі трывалае месца ў славянскай кухні. Яны не толькі пастаянны кампанент у разнастайных салатах і іншых стравах — іх выкарыстоўваюць у лячэбных мэтах, калі дрэнна працуе кішэчнік і ёсць схільнасць да запораў.

Даўно вядома, што гэта агародніна мае каштоўныя для здароўя ўласцівасці. Аднак падчас апошніх даследаванняў брытанскага інстытута Экстэра, якія праводзіліся цягам 15 гадоў, высветлілася, што іх карысныя ўласцівасці нашмат большыя, чым меркавалі раней.

Лічыцца нават, што медалямі, якія ў 2012 годзе атрымалі англічане на Алімпіядзе, яны абавязаны буракам, бо іх кармілі стравамі з гэтай агародніны і паілі бурачным сокам.

***— У чым карысныя ўласцівасці буракоў?***

— Яны могуць нармалізаваць высокі ціск і павялічыць падачу кіслароду ў тканках, такім чынам павышаючы іх вынослівасць пры тым, што менш трацiцца энергіі. Па даных гэтага брытанскага інстытута, ужыванне буракоў павялічвае КПД мышцаў да 19 %. Акрамя таго, яны павышаюць імунітэт.

Чырвоны колер буракі маюць за кошт лікапіну. Даўно вядома, што гэта магутны антыаксідант, які зніжае ўзровень халестэрыну і мае доказы супрацьракавага дзеяння. Акрамя таго, гэта агародніна, якая ўтрымлівае вялікую колькасць лікапіну, багатая на калій, які важны для паўнацэннай работы сэрца. Лікапін сам па сабе добры антыаксідант, змяншае верагоднасць з'яўлення ракавых пухлін і ўзровень халестэрыну ў сасудах.

Буракі ўтрымліваюць вялікую колькасць нітрату, які ператвараецца ў нітрыт, а той — у аксід нітрату. Аксід нітрату спачатку працуе як пашыральнік сасудаў, таму ён можа знізіць ціск на 5 адзінак рт. сл. Дзякуючы чаму ён на 10 % змяншае верагоднасць ішэмічнага інсульту галаўнога мозгу і інфаркту сэрца.

Акрамя гэтага, аксід нітрату пашырае сасуды ў пэўных участках галаўнога мозгу, якія адказваюць за ўвагу і засяроджанасць. Такім чынам, людзі, якія рэгулярна ўжываюць буракі, становяцца больш уважлівымі, могуць лягчэй засяродзіцца на пэўных праблемах і ім лягчэй удаецца іх вырашэнне.

Даследаванне паказала, што ў пажылых людзей, якія рэгулярна ўжываюць буракі, змяншаецца біялагічны ўзрост мозгу, і ён пачынае працаваць крыху лепш для свайго ўзросту, змяншаюцца праявы дэменцыі, рассеянасці.

Для спартсменаў, дзе ролю адыгрываюць секунды і долі секунды, 19 % маюць вялікае значэнне. А для людзей пажылога ўзросту гэта азначае, што ім лягчэй дайсці да крамы, выканаць нейкую працу па доме ці перанесці іншую фізічную нагрузку.

***— Ці мае значэнне, у якім выглядзе мы ўжываем буракі?***

— Для таго каб атрымаць максімум карысных уласцівасцяў, вельмі важна, як мы гатуем буракі. У многіх славян ёсць такая якасць: казаць, што так рабіў мой дзед, значыць, так буду рабіць і я. У той час калі ўвесь свет глядзіць наперад, робіць па апошніх методыках, славяне любяць зрабіць, як сто гадоў таму. Таму важна гатаваць правільна, а не так, як гэта выконвалі шмат гадоў таму.

Большасць людзей доўга вараць буракі. Нітрат, пра які я згадваў, водарастваральны, і для таго каб па максімуме выкарыстоўваць уласцівасці гэтага караняплоду, атрымліваецца, што мы павінны выпіць гэту ваду. Але натуральна, ніхто так не робіць, і атрымліваецца, што самае карыснае мы выліваем у ракавіну. А застаецца цукар і лікапін.

Згодна з апошнімі даследаваннямі, каб атрымаць максімум каштоўных рэчываў, мы павінны ўжываць буракі ў сырым выглядзе або запячы ў духоўцы, загарнуўшы ў фольгу, каб яны не страцілі сок. Пры варцы карысныя рэчывы буракі губляюць цягам 10 хвілін, але за такі час яны, вядома, не дойдуць да гатоўнасці.

Самае аптымальнае выйсце — піць бурачны сок.

***— Колькі яго патрэбна, каб атрымаць тую карысць, пра якую вы казалі? І як правільна гатаваць бурачны сок?***

— 2-3 буракі сярэдняга памеру ў суткі дастаткова, каб яны мелі карысная ўздзеянне.

Калі мы ўжываем сок адразу, няма розніцы, з дапамогай якой сокавыціскалкі мы яго атрымаем. Калі мы збіраемся піць яго на працягу дня і пакінуць больш чым на 45 хвілін, тады лепш падыходзіць шнэкавая сокавыціскалка. Такім спосабам сок менш узаемадзейнічае з кіслародам, і яго можна захоўваць даўжэй.

Сок хутка пачынае сваю работу ў нашым арганізме — літаральна праз 2-2,5 гадзіны. Паляпшаецца працаздольнасць, кровазварот галаўнога мозгу, КПД мышцаў, але калі спыніць яго прыём, то гэтак жа хутка яго дзеянне спыняецца — максімум праз 2-3 дні мы страцім гэтыя ўласцівасці. Таму, калі вы займаецеся спортам і хочаце дасягнуць лепшых вынікаў, мінімум за тры гадзіны да трэніроўкі сок варта прымаць. І рабіць гэта пастаянна.

Трэба сказаць, што не толькі буракі ўтрымліваюць вялікую колькасць нітрату. Шпінат, шчаўе, кроп, лімонная меліса таксама яго маюць. Але яны не ўтрымліваюць лікапіну, таму моцнага антыаксідантнага эфекту ад іх мы не атрымліваем.

Калі хтосьці не любіць сок буракоў паасобку, яго можна змешваць з яблычным, маркоўным і сельдэрэевым. Напрыклад, маркоўны сок з'яўляецца моцным антысептыкам, бо валодае добрымі антыбактэрыяльнымі ўласцівасцямі і паляпшае імунітэт. Але ўсё ж лідар у паляпшэнні працаздольнасці — буракі.

***— Ці ўсім можна ўжываць бурачны сок?***

— Яўных супрацьпаказанняў няма, акрамя таго, што ў невялікай колькасці ён можа вымываць кальцый з касцей і павялічваць перыстальтыку кішэчніка. Ну, і трэба памятаць, што ён падфарбоўвае мачу ў чырвоны колер. Каб выявіць індывідуальныя супрацьпаказанні, можна параіцца са сваім доктарам. Але, па вялікім рахунку, калі няма алергічнай рэакцыі і запушчанага астэапарозу, а таксама праблем з кішэчнікам, то бурачны сок можна ўжываць.

**Алена КРАВЕЦ.**

---

У згодзе з прыродай

# БУРЫ МЯДЗВЕДЗЬ, ЕЎРАПЕЙСКАЯ РЫСЬ І БАРСУК

## Што вядома пра гэтыя віды дзікіх жывёл у сучаснай Беларусі?



**Пачынаючы з 2021 года вучонымі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі праводзіцца навуковая работа па ацэнцы сучаснага стану папуляцый мядзведзя, рысі, барсука з наступнай распрацоўкай планаў кіравання папуляцыямі названых відаў дзікіх жывёл. Вынікі гэтага даследавання абнародавала Міністэства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

### СТАНОЎЧЫ ТРЭНД НА РЫСЬ

Так, у 2023 годзе колькасць еўрапейскай рысі склала 1315 асобін, і ў цэлым у краіне адзначаецца станоўчы трэнд змянення колькасці гэтага віду.

Улік колькасці рысі ажыццяўляецца карыстальнікамі паляўнічых угоддзяў сістэмы Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Міністэрства лясной гаспадаркі, Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў», Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, іншымі карыстальнікамі.

Станоўчы трэнд змянення колькасці еўрапейскай рысі па краіне з'яўляецца падставай для перагляду ў 2025 годзе катэгорыі нацыянальнай прыродаахоўнай значнасці віду — зніжэнне з ІІ катэгорыі да IV катэгорыі (пры падрыхтоўцы 5-га выдання Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь і зацвярджэнні Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя новага спіса рэдкіх і тых, што пад пагрозай знікнення, на тэрыторыі краіны відаў дзікіх жывёл, якія ўключаюцца ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь).

Разам з тым, у сувязі са зменлівай і невялікай колькасцю рысі, якая не дасягнула аптымальнай колькасці (1520 асобін) і якая засяляе не ўсе прыдатныя месцапражыванні, адсутнічаюць падставы для выключэння рысі са спіса рэдкіх і тых, што пад пагрозай знікнення, на тэрыторыі краіны відаў дзікіх жывёл, якія ўключаюцца ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

### ПАДЛІК МЯДЗВЕДЗЯ НА АЎСАХ

Колькасць мядзведзя ў 2023 годзе склала 700 асобін, і распаўсюджванне яго па тэрыторыі краіны не раўнамернае. Разам з тым дадзеная колькасць засноўваецца на анкетным метадзе ўліку, які мае вялікія хібы і выкарыстоўваецца для выяўлення на пачатковым этапе асноўных месцаў знаходжання мядзведзя з наступным улікам метадаў вясновага траплення і прамога падліку на аўсах.

У сувязі з гэтым казаць аб тым, што колькасць названага віду дасягнула свайго аптымальнага значэння, пры якім забяспечвалася б захаванне віду ў доўгатэрміновай перспектыве, няма падстаў. У той жа час у сукупнасці з біялогіяй самога віду (мінімальны і павольны рост узнаўлення), на жаль, захоўваюць сваю актуальнасць і асноўныя пагрозы, якія аказваюць негатыўны ўплыў на стан (колькасць) папуляцыі мядзведзя: асенне-зімовае паляванне на пушных звяроў і капытных, асабліва загоннае паляванне з выкарыстаннем сабак, якое прыводзіць да ўзняцця мядзведзяў з бярлогі і гібелі дзіцянят.

### БАРСУК ВА ЎРАЗЛІВЫМ СТАНЕ

Колькасць барсука ў Беларусі ў 2023 годзе ацэнена на аснове анкетнага апытання і даных, атрыманых з большасці адміністрацыйных раёнаў краіны, і складае каля 2307 асобін.

Як і ў папярэднія гады, найбольшая колькасць барсука выяўлена ў Віцебскай вобласці, дзе сканцэнтравана 56 працэнтаў беларускай папуляцыі гэтага віду. На астатняй тэрыторыі краіны адзначаецца раўнамернае размеркаванне яго колькасці (4—14 працэнтаў). Пры гэтым шчыльнасць беларускай папуляцыі барсука і распаўсюджвання жылых паселішчаў адна з самых нізкіх у арэале віду.

Разам з тым атрыманыя даныя паказваюць на значнае паляпшэнне стану папуляцыі барсука ў Беларусі за апошнія гады — павелічэнне ўзроўню колькасці, ёсць фрагменты з поўным асваеннем барсуком экалагічнай ёмістасці. Але ў цэлым яна ўсё яшчэ знаходзіцца ва ўразлівым стане: барсук адсутнічае на значнай частцы краіны, лакальныя папуляцыі барсука прыкладна ў 30 працэнтаў карыстальнікаў знаходзяцца ў дэпрэсіўным стане, і ў 16 працэнтах ад усіх гаспадарак устаноўлена знаходжанне барсука ў вельмі пагрозлівым стане.

У сувязі са зменлівай і невялікай колькасцю барсука, а таксама з яго адсутнасцю на прыдатных месцапражываннях немэтазгодна выключаць названы від з Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь. Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі прапанавана ўключыць яго ў наступнае выданне з паніжэннем яго ахоўнага статусу з ІІ катэгорыі да IV катэгорыі.

### ПРА МЕРЫ РЭАГАВАННЯ

Для мэт урэгулявання сітуацый, звязаных з выяўленнем дзікай жывёлы, якая можа ўяўляць пагрозу жыццю і здароўю людзей або знаходзіцца ў гаротным становішчы, у краіне пры мясцовых выканаўчых і распарадчых органах (базавага ўзроўню) створаны камісіі па аказанні дапамогі дзікай жывёле.

Прадстаўнікі камісіі выязджаюць на месца выяўлення дзікай жывёлы і, зыходзячы з існуючай сітуацыі, прымаюць адно з наступных рашэнняў:

аб адлове дзікай жывёлы. Жывёла можа быць перададзена на ўтрыманне фізічнай асобе, у тым ліку індывідуальнаму прадпрымальніку, або юрыдычнай асобе з іх згоды, або выпушчана ў натуральнае асяроддзе пасялення;

аб здабычы дзікай жывёлы. Яна можа быць здабыта ў выпадку, калі ўяўляе пагрозу жыццю і здароўю грамадзян або мае траўмы, несумяшчальныя з жыццём.

Рашэнне афармляецца актам аб выяўленні дзікай жывёлы і з'яўляецца падставай для прыняцця мер рэагавання.

Такім чынам, мясцовы выканаўчы і распарадчы орган абавязаны прыняць неабходныя меры рэагавання для ўстаранення магчымай пагрозы жыццю і здароўю грамадзян, звязанай з паводзінамі дзікай жывёлы, а таксама па аказанні ёй дапамогі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

Наўздагон

# ПЕСНІ, ПРЫСМАКІ, ЗІМОВЫ ЗАПЛЫЎ

## Стары Новы год Брэст адзначыў маштабным фестывалем

**Другі зімовы фестываль «Брэсцкія забавы» разгарнуў свае пляцоўкі на набярэжнай ракі Мухавец у раёне Гарадскога саду. Яшчэ з ранку пачалі работу шматлікія гандлёвыя павільёны. Прадавалі прысмакі і разнастайную сувенірную прадукцыю. Прапаноўвалі блінцы, дранікі, чабурэкі, выпечку, апетытныя шашлыкі.**



Свае выставы разгарнулі Брэсцкі абласны краязнаўчы музей і Музей гісторыі горада. Апошні прадставіў падборку здымкаў і паштовак, на якіх занатаваны гарадскія ёлкі розных гадоў. Атрымалася цікава і настальгічна. Ну і каля стэндаў краязнаўчага спыняліся многія ўдзельнікі фэсту, каб паглядзець на партрэты знакамітых людзей, згадаць пра значныя падзеі ў родным краі.

У поўдзень да працэсу шырокіх народных гулянняў падключыліся інтэрактыўныя пляцоўкі гарадскога камітэта БРСМ, Брэсцкага гарадскога аддзялення па НС, таварыства выратавання на водах, дэпартамента «Ахова». Каля пляцоўкі апошняга хадзіў добразычлівы чацвяраногі «супрацоўнік» і прыцягваў увагу дзяцей. Яны цягнулі за рукі бацькоў, разам падыходзілі да дзяўчыны ў форме, якая расказвала аб правілах бяспекі ў жыллі, на вуліцы, у грамадскіх месцах. Кожная з пляцовак старалася крэатывіць: людзі ў маскарадных касцюмах заклікалі наведвальнікаў прыняць удзел у віктарынах з абяцаннем прызоў. Іншыя цешылі народ песнямі і музыкай. Тым часам дыміла вялікая салдацкая кухня, прыцягваў цяплом аграмадны самавар.

Несумненным цвіком праграмы першага дня стала выступленне аматараў зімовага плавання. Месца для заплыву абсталявалі загадзя. Вялікая палонка была раздзелена на дарожкі з усімі абмежавальнымі знакамі. Да 15 гадзін, часу пачатку заплыву, гледачоў уздоўж берага было — не падступіцца. Энергічны вядучы правёў з аўдыторыяй «інфармацыйную пяцімінутку», расказаў пра карысць і рызыкі гэтага экстрэмальнага віду спорту. А потым заклікаў ахвотных з ліку публікі выйсці і акунуцца ў ледзяную ваду. І смяльчак знайшоўся. Даніілу прапанавалі спачатку зайсці ў цёплую палатку-лазню, якую абсталявала падраздзяленне МНС, пераапрануцца і выйсці да вады. Ён справіўся за лічаныя хвіліны і пад апладысменты гледачоў спусціўся і акунуўся з галавой. Потым асмялеў і другі глядач — Улад.

Тым часам пад песню «Мы верим твёрдо в героев спорта» на пляцоўку ў халатах, накінутых на купальныя касцюмы, спусціліся героі дня — больш за 20 мужчын і жанчын з Брэста, Баранавіч, Мінска — гатовых да заплыву. Інструктаж супрацоўніка таварыства выратавання на водах з папярэджаннем, што галоўнае ўсё ж — бяспека, — і пачынаецца заплыў. «Маржы» выходзяць па парах, спускаюцца па лесвіцы кожны на сваю дарожку, праплываюць адлегласць 12,5 метра і вяртаюцца. Першымі плаўчыхамі сталі Вольга Саўко і Ірына Петрачук. Жанчыны хутка праплываюць дыстанцыю, бадзёра выходзяць з вады і трапляюць у шчыльнае кола журналістаў.

— Уражанні самыя лепшыя, адчуванне лёгкасці, палёту, холад не цісне, усё цудоўна, — дапаўняюць адна адну Ірына і Вольга.

За імі добра спраўляюцца з заплывамі мужчыны. У чарзе на заплыў «маржы» размінаюцца ў такт музыцы, жартуюць. «Не ўсе героі носяць плашчы, некаторыя носяць плаўкі!» — спрабуе развесяліць трыбуну адзін з герояў дня. Гледачы не шкадуюць апладысментаў. «Памаліцца трэба перад тым, як апускаешся ў ваду,» — гукае адна са сталых глядачак аматару зімовага плавання. У адказ ён прывітна махае рукой. Адным словам, на гэтым атракцыёне эмоцый хапала і ўдзельнікам, і гледачам.

Але ж холад браў сваё, і многія накіроўваліся да паходнай кухні, якую падрыхтавалі вайскоўцы. Тут частавалі салдацкай кашай, на марозе яна прывабна дымілася. Аўтар гэтых радкоў пацікавілася ў сям'і, што апетытна ела кашу, пра адчуванні на свяце. Адказала маці сямейства Ірына Васільева: «Мы прыехалі з Мінска ў госці да сваякоў. Прыйшлі сюды ўжо дзве гадзіны таму, пакуль не збіраемся дадому. Усё цудоўна! Хочам паглядзець канцэрт».

Фестываль працягваўся. Многія стараліся зрабіць кадры на памяць у фотазонах, якіх было дастаткова. На сцэне выступалі самадзейныя і прафесійныя артысты. У разгар свята на сцэну выйшаў **старшыня Брэсцкага гарвыканкама Сяргей ЛАБАДЗІНСКІ**, каб прывітаць гасцей фестывалю і тых, хто яго арганізаваў. Мэр нагадаў, што два гады таму Брэст паспяхова правёў фестываль «Берасцейскія сані», які вырас у абласное свята і цяпер трыумфальна падарожнічае па гарадах вобласці. «Ну а Брэст узамен заснаваў новы фестываль — «Брэсцкія забавы», які ўпадабалі гараджане. Летась прайшоў першы, а цяпер праводзім другі,» — адзначыў кіраўнік горада.

Яркім штрыхом першага дня стала лазернае вогненна-піратэхнічнае шоу. У нядзелю фестываль працягваў святочны марафон.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

Калядны настрой

# З ПАЖАДАННЯМІ ДАБРА І МІРУ

## Удзельнікі народнага фальклорнага калектыву «Жывіца» пачалі каляднае шэсце па Гродзенскім раёне

**Калядаванне праходзіць у рамках абласной акцыі «Новы год у кожны двор». У першы дзень маршрут аказаўся даволі працяглым — святочнае шэсце сустракалі ў дзясятках дамоў аддаленых вёсак. Калядоўшчыкі спявалі беларускія абрадавыя песні, жадалі кожнаму моцнага здароўя, дабрабыту, добрага настрою на ўвесь год. Прыкметна, што музычны калектыў унёс новае гучанне ў старажытныя песні, якія яны прывезлі з фальклорных экспедыцый.**



«Стары год канчаем — Новы пачынаем, на цёплае лета, на буйнае жыта ідзём мы кругом свету і казу з сабой вядзём», — вітаюць гаспадароў калядоўшчыкі.

Найперш наведалі Яўгенію Пятроўскую і Марыю Богдзель у вёсцы Лікоўка.

— Ой, каза ўпала, хіба есці хоча, дайце козаньке што паесці, — суправаджаюць жартамі сваё выступленне ўдзельнікі калектыву. — Каза ў вас пахадзіла — будзе ў вас усё добра. Хай вам усяго даволі, а бяды ніколі!

Каза — персанаж абавязковы і самы камічны. Гэта сімвал урадлівасці. «Дзе каза рогам — там жыта стогам, дзе каза ходзіць — там пшаніца родзіць», — дэкламуюць калядоўшчыкі. У музычным ансамблі роля казы дасталася **работніку культуры Паўлу ЦЫБОВІЧУ.** У гэтым амплуа ён ужо 25 гадоў, і замены яму няма. Кажа, што роля не складаная, хоць і бывае імправізацыя. Тут галоўнае — смешна паваліцца на падлогу, нібы самлеўшы ад голаду, і падрыгаць нагамі — гаспадары нясуць пачастункі.

Вось і Яўгенія Пятроўская кладзе ў мяшок свае прысмакі. Жанчына на пенсіі, раней працавала на ферме. Святочную традыцыю памятае яшчэ з маладосці — тады калядавалі часта, прымалі гасцей з радасцю, клалі ў мех спецыяльна прыгатаваную ежу.

— Мы заўсёды адорвалі калядоўшчыкаў і зараз падрыхтавалі для іх пачастункі. Я спецыяльна спякла вафельныя трубачкі, — расказвае Яўгенія. — Здаўна так павялося — калі каляда ходзіць, шчасце ў дом носіць. Мне вельмі прыемна, што да мяне завіталі. Так і хочацца падпяваць, хоць слоў не ведаю.

Па ўсім бачна, што жанчына не хоча адпускаць вясёлую каляду, але ўдзельнікі шэсця ўжо ідуць да яе суседкі. Абедзве жанчыны жывуць у былым панскім маёнтку, які пабудаваны 120 гадоў таму. Дом захаваў знешні воблік, мае ўсе неабходныя камунікацыі. Марыя Богдзель сустракае гасцей на высокім ганку.

— Добры дзень гаспадарам! Ці дазволіце вам паспяваць, са святам павіншаваць? — пытаюцца калядоўшчыкі.

Гаспадыня і тут гатова падкарміць казу, каб тая была дужэйшая. Яна ўспамінае, што падчас працы ў сферы культуры не аднойчы выязджала ў вёскі з канцэртамі, вельмі прыемна, што зараз завіталі і да яе. Жанчына не сумуе, хоць і на пенсіі. У доме часта збіраецца яе вялікая сям'я — сёстры, дзеці, унукі. Нямала клопатаў і ў грамадскіх жыцці, бо Марыя — староста вёскі. Хутка пачне абход падворкаў для ўліку падсобнай гаспадаркі. Таксама сочыць за парадкам у вёсцы.

...А тым часам званочкі абвяшчаюць аб новым маршруце калядоўшчыкаў. Ён прывёў у вёску Саломенка да Любові Кітурка. Гаспадыня кажа, што і ў мінулым годзе яе дом з жартаўлівай шыльдай «Ранча ў Любы» не абышлі бокам. Яна вельмі ўражана і не хавае сваёй радасці. Пасля таго, як каза паваліцца на падлогу, жанчына хуценька нясе ёй пачастунак.

— Прыемна, што нас не забываюць, і летам работнікі культуры прыязджаюць з канцэртамі, аўталаўка ходзіць, вёска наша жывая, тут нават новыя дамы будуюцца, прыязджаюць на бацькоўскія сядзібы дзеці, даглядаюць іх. Лічу, што ў нас усё добра. І ўсім жадаю міру і дабрабыту, — эмацыйна выказваецца гаспадыня.

У планах калядоўшчыкаў — наведаць 30 дамоў. У асноўным маршрут складаецца з вёсак Квасоўскага сельскага Савета, але калектыў можа выехаць і ў іншыя мясціны, калі іх папросяць.

— Нашаму калектыву «Жывіца» дзесяць гадоў, пяць з іх прадстаўляем сваю калядную праграму. Стараемся ў першую чаргу наведваць сталых адзінокіх жыхароў. Спяваем велічальныя песні, якімі праслаўляем Хрыста. Гэта вельмі старадаўнія песні, яны распаўсюджаны па ўсёй Беларусі, але адрозніваюцца па манеры выканання. Мы карыстаемся традыцыямі нашых мясцін, пераймалі гэту манеру ад носьбітаў падчас фальклорных экспедыцый па Гродзенскім раёне. Такім чынам аднаўляем і іншыя абрады. Нядаўна ездзілі ў вёску Нецечы, там запісалі старадаўні абрад Валоканне, які праводзіцца на Вялікдзень, а ў аграгарадку Азёры пераймалі абрад Багач, яго рэканструкцыю мы ўпершыню правялі ў мінулым годзе, — расказвае **загадчык Квасоўскага дома культуры і народнай творчасці, кіраўнік фальклорнага гурта Дзяніс БАЛАБУЕЎ.**

За дзень работнікі культуры прайшлі з абрадам «Ідзе каляда, калядуючы» па вёсках Навасёлкі, Баранава, Лікоўка, Саломенка, Дайлідкі і аграгарадку Квасоўка. Святочныя шэсці прадоўжацца да 18 студзеня.

— У Гродзенскім раёне гэта традыцыя даволі распаўсюджана, усе дамы культуры рыхтуюць такі абрад, людзі з задавальненнем сустракаюць калядоўшчыкаў, каб паслухаць калядныя песні. Кожны цэнтр культуры мае сваю адметнасць, напрыклад, тут група ходзіць з буслом, які ўвасабляе сабой пасланніка Хрыста. У іншых ёсць персанаж мядзведзь. Хтосьці ходзіць з Дзедам Марозам і Снягуркай. А вось пастаянныя атрыбуты — гэта калядная зорка і каза як сімвал урадлівасці, — паясняе **дырэктар Гродзенскага раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра Аксана ГРЫНЦЭВІЧ.**

Па ўсім відавочна, што людзі вельмі рады калядоўшчыкам, бо, па старажытным павер'і, яны павінна прынесці радасць у дом.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Лепельпромшвеймебель»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Швейная машина 852 | 62,40 | 6,24 | 3,12 |
| 2 | Швейная машина 0-1022; швейная машина 0-1022; швейная машина 0-1022м; швейная машина 01022; швейная машина 0-1022м; швейная машина 0-1022м; швейная машина 0-1022м; швейная машина 0-1022; швейная машина 0-1022м; швейная машина 0-1022; швейная машина 0-1022; швейная машина 0-1022; швейная машина 0-1022 | 748,80 | 74,88 | 37,44 |
| 3 | Швейная машина 1022; швейная машина 1022; швейная машина 1022м; швейная машина 1022м; швейная машина 1022; швейная машина 1022; швейная машина 1022; швейная машина 1022; швейная машина 1022м; швейная машина 1022; швейная машина 1022м; швейная машина 1022; швейная машина 1022м; швейная машина 1022; швейная машина 1022м; швейная машина 1022; швейная машина 1022; швейная машина 1022; швейная машина 1022; швейная машина 1022м | 1 141,92 | 114,19 | 57,10 |
| 4 | Швейная машина; швейная машина; швейная машина; швейная машина; швейная машина; швейная машина; швейная машина; швейная машина; швейная машина; швейная машина | 565,92 | 56,59 | 28,30 |
| 5 | Швейная машина 51; швейная машина 51к; швейная машина 51; швейная машина 51 кл | 480,00 | 48,00 | 24,00 |
| 6 | Машина швейная универсальная мод. 31-32+50 №005175 | 139,20 | 13,92 | 6,96 |
| 7 | Швейная машина 8515; швейная машина 8515 | 230,40 | 23,04 | 11,52 |
| 8 | Машина петельная; закройная машина RL-4; швейная машинка 25-1 | 1 084,80 | 108,48 | 54,24 |
| 9 | Концевая линейка | 129,60 | 12,96 | 6,48 |

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 10 | Капитальное строение с инвентарным номером 230/С-15130 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад, общая площадь – 39,00 кв. м, составные части и принадлежности – крыльцо) | Витебская область, Лепельский район, г. Лепель, ул. Володарского, 1/4 | 3120,00 | 312,00 | 156,00 |
| 11 | Капитальное строение с инвентарным номером 230/С-15129 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада, общая площадь – 53,9 кв. м) | Витебская область, Лепельский район, г. Лепель, ул. Володарского, 1/5 | 4320,00 | 432,00 | 216,00 |
| 12 | Капитальное строение с инвентарным номером 230/С-15134 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – компрессорная, общая площадь – 33,0 кв. м). Оборудование: трансформатор ТМГ-400/10 – 3 шт.; камеры КСО 366-6 шт. | Витебская область, Лепельский район, г. Лепель, ул. Володарского, 1 | 40200,00 | 4020,00 | 2010,00 |
| 13 | Капитальное строение с инвентарным номером 230/С-15135 (назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – котельное, общая площадь – 207,0 кв. м) | Витебская область, Лепельский район, г. Лепель, ул. Володарского, 1 | 26040,00 | 2604,00 | 1302,00 |

В отношении лотов №№ 1–9 проводятся четвертые повторные торги. **Стоимость снижена на 60 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда»: № 34 (29914) от 21.02.2023, стр. 6., № 79 (29959) от 27.04.2023, стр. 10, № 136 (30016) от 18.07.2023, стр. 15, № 167 (30047) от 30.08.2023, стр. 15. В отношении лотов №№ 10–13 проводятся первые торги

**Местонахождение лотов №№ 1–9:** Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Володарского, 1

| | |
|---|---|
| **Земельный участок** | Лоты №№ 10–13 расположены на земельном участке с кадастровым номером 241200000001000283 площадью 0.9829, назначение – земельный участок под производственную базу. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав: зем. участки, расположенные на природных территориях подлежащих специальной охране (в охранной зоне реки, водоема), код – 2,4, площадь – 0,9829 га. На часть земельного участка имеется сервитут |
| **Дата и время проведения торгов** | **В отношении лотов №№ 1–9: 29 января 2024 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)**<br>**В отношении лотов №№ 10–13: 16 февраля 2024 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)**<br>по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | В отношении лотов №№ 1–9: с 10.00 16 января 2024 года до 16.00 25 января 2024 года<br>В отношении лотов №№ 10–13: с 10.00 16 января 2024 года до 16.00 14 февраля 2024 года |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту ___, ОАО «Лепельпромшвеймебель», проводимых __.__.2024.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней (по лотам №№ 1–9) и в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней (по лотам №№ 10–13) с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 5 (пяти) рабочих дней (по лотам №№ 1–9) и не позднее 30 календарных дней (по лотам №№ 10–13) со дня заключения договора.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Ирина Сигизмундовна, +375298903354. Дополнительная информация по предмету торгов по тел. +375293058650, Алена.**

8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «Лепельпромшвеймебель» в лице ликвидатора – ООО «Партнер-Консультант»,**<br>**тел.: 8 (017) 255-29-28, 8 (029) 304-59-90; e-mail: info.kp@tut.by**<br>**(211180, Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Володарского, д. 1, УНП 300038815)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97**<br>**• e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел. (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **УП «Комбинат декоративно-прикладного искусства им. А.М. Кищенко»** (УНП 600126458), 222520, г. Борисов, ул. Блюхера, 19, тел. 8 033 688 86 54, в лице ликвидатора ООО "Правовая компания «Делегат».

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены **29 января 2024 г. с 11.00 до 16.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Кабина распылительная, инв. № 328-2 | 100,00 |
| 2 | Кабина распылительная, инв. № 328 | 100,00 |
| 3 | Станок точильно-модельный, инв. № 369 | 120,00 |
| 4 | Станок точильно-модельный, инв. № 368 | 120,00 |
| 5 | Шкаф сушильный № 5, инв. № 288 | 60,00 |
| 6 | Изолированное помещение с инвентарным № 610/D-71653 (квартира), общ. пл. 19,4 кв. м, по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Блюхера, д. 19, кв. 4 | 8 293,88 |

Телефон для ознакомления и осмотра: +37529-698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок **с 17.01.2024 г. с 09.00 по 26.01.2024 г. до 16.00:**

1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY;

2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену за лот. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 календарных дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов: не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 14.12.2023 г.

агролизинг
лизинговая компания ОАО«Белагропромбанк»
УНП 190738158

**Открытое акционерное общество «Агролизинг»**
осуществляет свою деятельность с 2006 года,
входит в состав банковского холдинга ОАО «Белагропромбанк».
Телефон **8 017 311 28 82**
Короткий номер **236 (А1, МТС, life)**
Информация по специальным лизинговым программам на сайте:
**www.agroleasing.by**

График проведения личного приема граждан, их представителей, представителей юридических лиц директором ОАО «Агролизинг», его заместителями и главным бухгалтером ОАО «Агролизинг»:

| Должность | Проведение приема | | |
|---|---|---|---|
| | День | Время | Место |
| Директор | Каждый второй вторник месяца | 16.30 – 17.30 | Каб. 31 |
| Заместитель директора | Каждая первая среда месяца | 16.00 – 17.00 | Каб. 30 |
| Заместитель директора | Каждый третий четверг месяца | 16.00 – 17.00 | Каб. 23 |
| Главный бухгалтер | Каждая четвертая среда месяца | 16.00 – 17.00 | Каб. 29 |

Республика Беларусь, 220005, г. Минск, ул. Красная, 13-31.

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

### информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего коммунальному унитарному предприятию компьютерных и информационных технологий «Инфотехсервис»

**Аукцион состоится 31.01.2024 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | **Лот № 1: автомобиль DAEWO NEXIA,** регистрационный знак 7716 IX-4, 2013 года выпуска, цвет черный, кузов (рама) № XWB3L32EDDA032144, разрешенная масса (кг) 1404, пробег 236 762 км |
| **Начальная цена продажи** | 1 380 руб. (одна тысяча триста восемьдесят рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 138 руб. (сто тридцать восемь рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 29.01.2024 г. до 15.00** |

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 23.11.2023 г.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению **ОАО «Горняк»** (продавец)
проводит открытый аукцион
по продаже недвижимого имущества:

### Лот № 1: здание бани

**с инвентарным номером 644/С-53302 площадью 180,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625085402601000351 (право аренды по 17.11.2034) площадью 0,0617 га, по адресу: Минская область, Солигорский район, Чижевичский с/с, аг. Жабин, ул. Юбилейная, 8А.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **36 240,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены 3 624,00 бел. руб.

### Лот № 2: здание комплексного приемного пункта

**с инвентарным номером 644/С-34045** (составные части и принадлежности: уборная, сарай) **площадью 146,1 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625085409301000280 (право постоянного пользования) площадью 0,2083 га, по адресу: Минская область, Солигорский район, Чижевичский с/с, д. Погост-1, ул. Зиновьева, 45А.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **27 720,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – 2 772,00 бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона в размере **7 (семи) процентов** от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **20.02.2024** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.02.2024** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17, 516-80-64.**
**Тел. для осмотра (8044) 783-82-52.**

УНП 600071102

Бацькаўшчына. У пошуках страчанага

# БАБРУЙСК

**Люблю завітваць у Бабруйск, калі «звезена лета ў стагі», калі «нівы, паляны, лугі / Знесены ў кошыках зручных». Тады і «нават пейзажы з ракі // Нейкі мастак гарадскі // Шумна ў рулоны паскручваў»... Тады стараюся павандраваць па старым горадзе, па тых вуліцах і вулачках, дзе гаспадарыць так званы прыватны сектар.**

Гісторыя забірае нешта ў свае недры і пільна ахоўвае, стараючыся пад пылам сваіх даўніх папер утрымліваць многія і многія таямніцы. Бабруйск здаўна быў цэнтрам яўрэйскага жыцця не толькі ў Беларусі, але і ўвогуле ў Расійскай імперыі. Нездарма ж адзначаны і радком у славутым рамане Ільфа і Пятрова. Таму напрыканцы XIX — у пачатку XX стагоддзя тут было магутнае яўрэйскае кніжнае выдавецтва. Пагадзіцеся, для сённяшніх, блізкіх да нас дзесяцігоддзяў, факт крыху дзіўны... Не выключана, дарэчы, што поруч з рэлігійнай літаратурай яно выдрукоўвала і фатаграфічныя выявы горада. А ў 1920-я гады працавала і выдавецтва Якава Гінзбурга, якое, між іншым, выдала апошні ў передваенным СССР зборнік яўрэйскіх малітваў.



Бабруйск. Гасцініца «Бярэзіна» (1918 год).

### Бабруйск — радзіма пісьменніцы Паліны Венгеравай

Дарэчы, шкада, што галоўны твор жыцця нашай зямлячкі бабруйчанкі Паліны Венгеравай «Успаміны бабулі» — не перакладзены на беларускую мову. У кнізе гэтулькі цікавага матэрыялу, што яна ўспрымаецца не толькі як мастацкі твор, але і нагадвае сабою збор этнаграфічных, дакументальных звестак пра жыццё ў дзевятнаццатым стагоддзі, пра сутыкненні рэлігій і светапоглядаў, пра розныя сацыяльныя групы нашых папярэднікаў.



Бабруйск. Свята-Мікалаеўскі сабор (пач. XX стагоддзя).

Сапраўднае прозвішча Венгеравай, якая нарадзілася ў 1833 годзе, — Эпштэйн. Дарэчы, паблізу ад Бабруйска, у старажытным мястэчку Пухавічы жыла таксама вядомая сям'я Эпштэйнаў. Родам з яе — заснавальнік славутага эстраднага калектыву «Хор Турэцкага». У адзін са сваіх прыездаў у Беларусь ён наведаў гэтыя, пухавіцкія, мясціны, пакланіўся той магіле, дзе знаходзяцца астанкі сотняў пухавічан — першых ахвяр Вялікай Айчыннай... А на рускай мове двухтомныя «Успаміны бабулі» Паліны Венгеравай пабачылі свет у 2003 годзе. Варта нагадаць, што дачкою пісьменніцы з Бабруйска з'яўляецца перакладчыца і літаратурны крытык Зінаіда Венгерава.

У сям'і беднага настаўніка ў Бабруйску ў 1878 годзе нарадзіўся будучы пісьменнік Восіп Тункель (памёр у Нью-Ёрку ў 1949 годзе). Наш зямляк як пісьменнік-гумарыст і мастак-карыкатурыст больш вядомы пад псеўданімам Дэр Тункелер (Цёмны). Пісаў на ідзішы. У 16 гадоў паступіў у Віленскую школу малявання, якую на той час узначальваў Іван Трутнеў. Пасля пераехаў у Адэсу, захапіўся паэтычнай творчасцю. Першыя вершы надрукаваў у 1901 годзе. У Варшаве ў 1912 годзе пабачыла свет першая гумарыстычная кніга нашага земляка «Зялёны папугай». Пасля смерці літаратара — у 1951 годзе — надрукавана яго кніга «Віленскі перыяд майго жыцця».

У Бабруйску нарадзіўся вядомы расійскі вучоны Саламон Давыдавіч Кацнельсон (30 ліпеня 1907 года), доктар філалагічных навук, дасведчаны лінгвіст. У асноўным займаўся германістыкай, мовай скандынаўскіх краін. Напісаў некалькі работ па філасофіі, гісторыі моў. Доктарскую дысертацыю абараніў яшчэ ў 1939 годзе. Выкладаў у Ленінградскім універсітэце. З 1953 года — на працы ў Ленінградскім аддзяленні Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук СССР.

Са знакамітых бабруйчан — і славуты савецкі спартсмен Антон Пятровіч Войцах (нарадзіўся ў лістападзе 1937 года). Адзін з лепшых шахматыстаў свету па перапісцы. У 1977—1982-м — чэмпіён Еўропы ў складзе зборнай каманды СССР. Прозвішча нашага земляка занесена ў энцыклапедыю «Шахматы», выдадзеную ў Маскве ў 1990 годзе.

Калі ўжо зайшла размова пра спартсменаў, то нельга не згадаць імя Веніяміна Барысавіча Гарадзецкага (нарадзіўся ў Бабруйску 13 красавіка 1919 года). Знакаміты шашыст. Трэнер і шашачны кампазітар. У 1962 годзе адзначаны званнем гросмайстра СССР. Пасля атрымаў і тытул міжнароднага гросмайстра. Чэмпіён СССР па рускіх шашках. Акадэмік Пецярбургскай Акадэміі шахматнага і шашачнага мастацтва. Першыя свае шашачныя кампазіцыі друкаваў яшчэ ў даваенным яўрэйскім часопісе «Акцябэр» у Мінску. А ў 1935 годзе ў Бабруйску нарадзіўся яшчэ адзін шашыст — Восіп Барысавіч Функ, заслужаны трэнер Малдовы, майстар спорту, міжнародны арбітр. Сярод яго вучняў — чэмпіёны свету Іон Доска і Алена Барысава.



Бабруйск. Прыстань на рацэ Бярэзіна (пач. XX стагоддзя).

Бабруйск — радзіма гісторыка Самуіла Лазінскага (нарадзіўся ў 1874 годзе). У 1907—1913 гадах ён з'яўляўся адным з рэдактараў «Яўрэйскай Энцыклапедыі». Аўтар многіх кніг па гісторыі Сярэдневечча. Яшчэ ў Кіеве ў 1904 годзе пабачыла свет яго кніга «Гісторыя Другой французскай рэвалюцыі». З цікавасцю і цяпер чытаецца яго праца «Сацыяльныя карані антысемітызму ў Сярэдневеччы і ў наш час», хаця і выдадзена ў 1929 годзе.

Бабруйск — радзіма расійскага педагога Яўгена Якаўлевіча Голанта (нарадзіўся ў 1888 годзе). Закончыў гісторыка-філалагічны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта. У 1920-я гады, калі ў СССР змагаліся за пісьменнасць, шырокай папулярнасцю карыстаўся дапаможнік Я. Голанта для дарослых «Будзем вучыцца». Наш зямляк — стваральнік многіх буквароў, метадычных дапаможнікаў, аўтар «Буквара селяніна» (1922). У сааўтарстве з іншымі вучонымі напісаў «Гісторыю педагогікі» (1940).

Яшчэ адно імя, якое не часта згадваецца ў дачыненні да Беларусі... 6 сакавіка 1923 года ў Бабруйску нарадзіўся кампазітар, музыкант, дырыжор Леанід Веніямінавіч Фейгін (памёр у Лондане 1 ліпеня 2009 года). Вучань Давыда Ойстраха, аўтар многіх музычных твораў амаль ва ўсіх жанрах. Гэта ён з'яўляецца стваральнікам калісьці папулярнага балета «Зоркавая фантазія» (пастаўлены ў Маскве ў 1963 годзе). Л. Фейгін — аўтар кнігі «Маё жыццё» (Масква, 1993 год).

Калі выкладаю ўсе гэтыя жыццяпісы сваім бабруйскім знаёмым, не перастаюць здзіўляцца : «А чаму мы рэдка згадваем пра іх у Бабруйску?..» Вось і я часам задумваюся над гэтым пытаннем. Бабруйск сёння — сімпатычны, цікавы сваім добраўпарадкаваннем горад. Спадзяюся, што знойдзецца ў клопатах сённяшніх бабруйчан месца і для мемарыялізацыі памяці пра сваіх славутых землякоў.


Бабруйск.Скобелеўская вуліца (пач. XX стагоддзя).



Бабруйск. Гарадская ўправа (пач. XX стагоддзя).

А зусім нядаўна атрымаў ліст ад рускай пісьменніцы Ларысы Чаркашынай (яна нарадзілася, між іншым, на Гродзеншчыне, у Ваўкавыску). Дзеліцца сваім жаданнем наведаць Бабруйск і прывезці мясцовым бібліятэкарам, музейшчыкам новыя, нядаўна знойдзеныя звесткі пра сувязь нашчадкаў Аляксандра Пушкіна з Бабруйскам, Бабруйшчынай. А я паведаміў пра гэта жаданне ў Бабруйскую гарадскую бібліятэку. Там, дарэчы, праводзіцца велізарная праца па захаванні памяці пра родзічаў Аляксандра Сяргеевіча...

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

*Старыя паштоўкі з калекцыі лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра Ліхадзедава.*

Разгадкі гісторыі

# УНЁСАК МАЙСТРА

## Хто ж ствараў слуцкія паясы?

**У часы Рэчы Паспалітай слуцкія паясы былі неад'емным атрыбутам эліты. Яны сведчылі пра статус, заможнасць гаспадара, падкрэслівалі яго густы. Праз пару стагоддзяў паясы ўжо сталі ўсенародным сімвалам. Пра іх у сваім вершы «Слуцкія ткачыхі» пісаў Максім Багдановіч. Узоры і матывы паясоў выкарыстоўваліся пры афармленні кніг, афіш, плакатаў, а ў пасляваенныя гады — нават ліхтарных слупоў у Мінску, Віцебску і Гомелі.**



Больш даведацца пра тое, як узнік такі феномен можна дзякуючы манаграфіі «Маджарскія: армянскі род у гісторыі Беларусі». Гэта вынік амаль пяцігадовай працы, праведзенай Фондам развіцця і падтрымкі армяназнаўчых даследаванняў «АНІВ» сумесна з Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі.

— Паясам і іх вытворчасці было прысвечана нямала работ у беларускай, польскай, украінскай, літоўскай, расійскай гістарыяграфіях, — адзначае **кандыдат гістарычных навук, архівіст, гісторык, адзін з аўтараў даследавання Дзяніс ЛІСЕЙЧЫКАЎ**. — Мы ж вырашылі падысці па-іншаму. Падысці з боку «чалавечага фактару». Знайсці звесткі пра людзей, якія стваралі паясы.

Дзіўна, але на імя стваральніка паясоў майстра-ткача Яна Маджарскага папярэднія даследчыкі ўпершыню звярнулі ўвагу толькі ў 1870-я гады. Многія звесткі, звязаныя з лёсам гэтага чалавека, да апошняга часу наогул заставаліся нявысветленымі. Існавалі версіі пра яго турэцкае, украінскае, венгерскае і армянскае паходжанне. Неабходна было высветліць, калі Маджарскія прыехалі на нашы землі, бо ў розных работах разбежка атрымлівалася ў 15–20 гадоў. Невядомая была і дата смерці Яна Маджарскага.

Была блытаніна і наконт таго, колькі існавала персіярняў, — адны даследчыкі лічылі, што ў Нясвіжы і Слуцку былі розныя фабрыкі, якія канкурыравалі паміж сабой.

Міхаіл Казімір Радзівіл (Рыбанька) запрасіў Яна Маджарскага працаваць на фабрыку ў Нясвіжы. У радзівілаўскіх архівах захаваўся дакумент, які сведчыў пра налічэнне заробку майстрам. Адпаведна ўжо ў студзені 1757 года персіярня ў Нясвіжы пад кіраўніцтвам Яна Маджарскага працавала. А вось у Слуцку, які належаў брату Міхаіла Казіміра Гераніму Фларыяну Радзівілу, фабрыкі на той час не было.

### САКРЭТЫ ПОСПЕХУ

Мода на персідскія паясы і кунтушовыя строі прыйшла з Асманскай імперыі, з якой з XVI стагоддзя Рэч Паспалітая вяла войны. Такі трэнд улавілі армянскія рамеснікі і пачалі ткаць для хрысціянскіх рынкаў. Некаторыя з іх работалі ў Асманскай імперыі, частка майстроў асела ў Рэчы Паспалітай. У Станіслаў (сучасны Івана-Франкоўск) якраз і прыехаў працаваць Ян Маджарскі. Перспектыўнага маладога майстра Рыбанька перавабіў у Нясвіж.

— Безумоўна, Радзівіл меў вялікія амбіцыі і хацеў знайсці найлепшага майстра. Для гэтага звяртаўся да аднаго з самых уплывовых членаў армянскай абшчыны, купца Сімона Нікаровіча, які ў той час быў буйнейшым пастаўшчыком персідскіх паясоў у Рэчы Паспалітай. Важна, што Радзівіл добра ставіўся да Яна Маджарскага і даваў яму развівацца. Напачатку ў іх былі партнёрскія адносіны, пасля Маджарскія атрымалі фабрыку ў арэнду. Фактычна Маджарскім быў дадзены карт-бланш, — раскрывае перадумовы для стварэння сапраўднага феномена, якім за кароткі час стануць паясы, зробленыя пад кіраўніцтвам Яна Маджарскага, **генеральны дырэктар Фонду развіцця і падтрымкі армяназнаўчых даследаванняў «АНІВ» Армэн ХЕЧАЯН, аўтар ідэі даследавання і кіраўнік дадзенага праекта**.

### САМОТНЫ МАЙСТАР

У 1758 годзе Ян Маджарскі і Міхаіл Казімір заключылі кантракт, прычым майстар быў задзейнічаны ў вырабе шпалер, макат, а ўжо паясы сталі, так бы сказаць, таварам-люкс. Пэўны час не было вядома, дзе ў Нясвіжы знаходзілася персіярня. Аўтары манаграфіі давялі, што яна месцілася ў палацава-паркавым комплексе Кансаляцыя. Сведчанне таму можна знайсці ў дзённіках Міхаіла Казіміра Радзівіла, дзе ён піша, як ездзіў глядзець вырабы.

Спрэчкі ўзнікалі і наконт месца фабрыкі ў Слуцку. Пэўны час у інтэрнэце нават хадзіў здымак пачатку XX стагоддзя двухпавярховага мураванага будынку, падпісаны як былая персіярня. Насамрэч гэта была фатаграфія ранейшай бібліятэкі слуцкага калегіума езуітаў, у якім, хутчэй за ўсё, вучыўся сын Яна Маджарскага Леан.

Пад персіярню былі задзейнічаны будынкі казарм гранд-мушкецёраў. Сюды ў 1760 годзе пасля смерці брата Гераніма Фларыяна, які не меў нашчадкаў, Радзівіл Рыбанька вырашыў перавесці вытворчасць паясоў. У той час гэта быў сапраўдны горад-крэпасць, тэрыторыі якога прадпрымальны Радзівіл адразу знайшоў прымяненне. Магчыма, заморскага майстра ў Слуцк ён перапраўвіў, каб таму цяжэй было збегчы. Справа ў тым, што сям'я Яна Маджарскага (жонка, сын і тры дачкі) заставалася ў Стамбуле. Ён цяжка перажываў доўгае расстанне з імі. Па дакументах удалося высветліць, што ўвесну 1761 года майстар нават зрабіў спробу ўцячы. Захапіў з сабой паясы быццам для продажу і з'ехаў у невядомым напрамку. Пра гэта Радзівілу паведамляў нясвіжскі камендант. Агенты князя перахапілі ўцекача ў Бродах (Цэнтральная Украіна). Майстра даставілі ў Нясвіж, дзе той прызнаўся Радзівілу, што збег выключна па сямейных абставінах. Рыбанька, які вельмі цаніў мэтра, паабяцаў Маджарскаму прывезці яго сям'ю са Стамбула. Гэта справа была няпростай, яна расцягнулася на чатыры гады. Агенты князя не толькі адшукалі жонку Маджарскага, але і выплацілі яе вялікія пазыкі. Сям'я ўз'ядналася ў другой палове 1766 года.

Аўтары вырашылі прасачыць лёс знакамітага роду. Будынкі і мясціны, якія належалі Маджарскім у XVIII—XIX стагоддзях, знаходзіліся на тэрыторыі Асіповіцкага, Баранавіцкага, Ляхавіцкага, Навагрудскага, Слуцкага і Нясвіжскага раёнаў. Якім склаўся лёс дачок Яна Маджарскага, яшчэ трэба высветліць. А вось пра сына, які пасля бацькі кіраваў фабрыкай, захавалася больш інфармацыі. Унучка Леана, Эльжбета, выйшла замуж за Чэслава Манюшку, і ў гэтай пары нарадзіўся сын Станіслаў, які стаў знакамітым кампазітарам.

Па мужчынскай лініі род згас у 1860-х гадах. Апошняй з Маджарскіх Вікторыі (па мужу Крушынскай), не стала ў 1886 годзе, яе надмагілле можна пабачыць у Мінску на Кальварыйскіх могілках.

Сярод цікавостак, якія ўдалося адшукаць, — сувязі Яна Маджарскага са знакамітай лекаркай, пісьменніцай Саламеяй Русецкай. У адзін час яны жылі ў Стамбуле, пасля — служылі пры двары Радзівіла. Ужо ў паважным узросце Ян Маджарскі паехаў у Стамбул па даведку аб сваім паходжанні, каб пацвердзіць дваранскія карані. Ён звярнуўся да мясцовай армянскай абшчыны, атрыманы там дакумент заверыў Станіслаў Піхельштэйн — сын Саламеі Русецкай.

Атрымаць шляхецкія правы Ян Маджарскі не паспеў, затое гэта зрабіў яго сын Леан. Род Маджарскіх займеў уласны герб Дар, які аўтары даследавання змясцілі на вокладцы кнігі.

### І ТЧЭ ЗАБЫЎШЫСЯ РУКА...

У выданні можна пабачыць старыя планы горада, на якіх размешчаны будынкі персіярні. У 1797 годзе губернскі архітэктар Фёдар Крамер працуе над планам перабудовы аднаго з будынкаў фабрыкі пад казармы для Нізоўскага палка. Вядома, што пасля смерці Караля Станіслава Радзівіла ў 1790 годзе, канчатковага падзелу Рэчы Паспалітай і далучэння земляў да Расійскай імперыі, персіярня пачала прыходзіць у заняпад. Задума Крамера так і не была рэалізавана, а створаная ім схема — на сёння адзіная вядомая падрабязна пададзеная выява фабрыкі.

У лепшыя ж часы, калі вырабы персіярні былі надзвычай папулярнымі, тут працавала каля 60 сем'яў. Адзін з двух будынкаў фабрыкі быў вытворчым, а другі служыў жытлом для работнікаў. Ткалі пераважна мужчыны, але і іх жонкі маглі быць задзейнічаны на вытворчасці. Па дакументах можна нават прасачыць імёны майстроў. Дарэчы, прыгонныя на фабрыцы ніколі не працавалі. Сюды ўладкоўваліся прадстаўнікі мяшчанскага саслоўя, пераважна мясцовыя жыхары з Нясвіжскага і Слуцкага рэгіёнаў.

Адна знаходка сапраўды ўражвае. Гэта ліст каменданта Слуцка ад 1760 года, калі фабрыка яшчэ толькі пераязджала ў гэты горад. Мужчына дакладваў Радзівілу, што ўстанаўліваючца станкі, што работнікі будуць навучацца murzynki (негрыцянкі). Дарэчы, раней гэты дакумент ужо трапляўся ў рукі даследчыкаў, праўда, слова «мужынкі» падавалася сугучным слову мужычкі. Але ж сапраўды магло так стацца, што аднымі з першых на фабрыцы працавалі цемнаскурыя нявольніцы. Справа ў тым, што ў абодвух братоў Радзівілаў былі тэатральныя трупы, у якія ўваходзілі і цемнаскурыя акцёры. Пасля смерці Гераніма Фларыяна яго трупа аказалася незапатрабаванай і яе ўдзельніцам спрабавалі знайсці новае прымяненне...

Дзяніс Лісейчыкаў падзяліўся, што нарэшце ўдалося расшыфраваць гаспадарчыя запісы, якія вялі Ян і Леан Маджарскія. Было зразумела, што майстры карысталіся армянскімі літарамі, вось толькі складнага тэксту ўбачыць у дакументах не атрымлівалася. Але калі была зроблена транскрыпцыя з армянскага алфавіта, стала зразумела, што тэкст напісаны пераважна польскімі словамі. У гэтых запісах майстры пазначалі, колькі матэрыялу ішло на паясы, якой яны былі расфарбоўкі, кошту. Дарэчы, па колерах паясоў, зробленых Маджарскімі, можна таксама ўдакладняць час іх стварэння. Напрыклад, Рыбанька загадваў майстру не выкарыстоўваць чырвоны колер. Так і было да 1762 года, калі князя не стала.

З дакументаў можна атрымаць звесткі, хто станавіўся ўладальнікам паясоў. Былі ў фабрыкі і асаблівыя заказчыкі. Так, па замове епіскапскага двара быў вытканы амафор для Віктара Садкоўскага, які адначасова быў і Слуцкім архімандрытам. Гэта ўнікальны выраб: адзіны твор з выявай жывой істоты — Агнца Божага. Гэта адсылка да царкоўнай сімволікі, але ў той жа час Агнец быў і на гербе армянскіх абшчын. Амафор захоўваецца ў фондах Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# МОРЫ РЭАЛЬНЫЯ І ЎЯЎНЫЯ

## Адкрылася выстава пра летні адпачынак класікаў

**«Чытаю біяграфіі нашых класікаў. Многіх я знаў асабіста. Як іх залізаныя і прычасаныя партрэты розняцца ад тых, якімі яны былі ў сапраўднасці людзьмі, у меру святымі і ў меру грэшнікамі, а не нейкімі манекенамі...»**

Гэтыя словы Максіма Танка зрабіліся лейтматывам выставы «Моры рэальныя і выдуманыя. Беларускія літаратары на вакацыях». Выстава з'яўляецца сумесным праектам Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва і Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў. Праект адметны яшчэ і тым, што ў пару зімовых свят глядач атрымлівае магчымасць перанесціся да цёплага мора, адчуць тое, што адчувалі беларускія паэты і пісьменнікі падчас летняга адпачынку. Надзвычай цікава разглядаць фотаздымкі, якія не прызначаліся для публікацый, рабіліся для сябе, для хатняга альбома, дзе героі без гальштукаў і афіцыйных касцюмаў, з валасамі, ускалмачанымі ветрыкам, са шчаслівымі ўсмешкамі... Хоць архіўныя фотаздымкі чорна-белыя, іх дапаўняюць каляровыя карціны беларускіх мастакоў з фонду НЦСМ і адмысловае афармленне. Вось маладыя Янка Брыль у Неапалі, Уладзімір Дубоўка і Янка Купала на пляжы ў Ялце... Уладзімір Караткевіч сустракае «пацалункі салёнай марской вады», змушаючы прыгадаць сваё апавяданне «Залаты бог».

Але не ўсе адпачынкі звязаныя з выездам на экзатычную прыроду. Для Якуба Коласа морам было і поле ржаных каласоў — як вядома, ён нават займаўся селекцыяй на ўчастку свайго дома ў Мінску. Максім Танк не меней, чым далёкія падарожжы ў цёплыя краі, любіў адпачываць і натхняцца ля роднай Нарачы.

Шчаслівыя, расслабленыя твары... Мора, горы, пальмы. Пісьменнікі часта выязджалі на мора яшчэ і таму, што да іх паслуг былі дамы творчасці — у Ялце, Піцундзе, Кактэбелі, Місхоры... З падабраных у буклеце выставы цытат з творчасці пісьменнікаў атрымліваецца незвычайны канцэптуальны твор — «мора беларусаў».



Маршруты летніх вакацый абавязкова пакідалі след у напісаным. Калі ў 1938 годзе Якуб Колас і Янка Купала адпачывалі ў Грузіі, у санаторыі Цхалтуба, Купала склаў верш: «Грузія, дружная з сонцам краіна, // Як жа ты сэрца і думкі салодзіш!» Гледзячы на фота ў экспазіцыі, можам згадаць не толькі кнігі, але і асабістую перапіску. «Але галоўнае — мора. Пішу цяпер вечарамі, а ўдзень не магу без яго. Берагі сухія, як перац у перачніцы, зморшчкаватыя, як мозг, як далонь малпы, а сярод іх дзівоснага спакою вада, жыццё, усё, дзеля чаго варта дыхаць. Днямі забіраюся ў скалы і ляжу на распаленых баках, як яшчар», — так распавядаў Янку Брылю свае ўражанні ад паездкі ў Кактэбель у 1962 годзе Уладзімір Караткевіч. Шчаслівы твар маладога класіка таксама можна пабачыць на архіўных фота.

Выставу можна наведаць да 18 лютага 2024 года.

**Людміла ІВАНОВА.**

Кніжныя навінкі

# ЭТНАГРАФІЧНАЯ ЭКСПЕДЫЦЫЯ. СТАГОДДЗЕ НАЗАД...




**У 1923 годзе Інбелкульт і Галоўархіў Беларусі арганізавалі і правялі этнаграфічную экспедыцыю. Сабраныя экспанаты былі прадстаўлены ў беларускім павільёне Першай Усесаюзнай сельскагаспадарчай і кустарна-прамысловай выстаўкі ў Маскве. А пасля сталі асновай этнаграфічнай экспазіцыі Беларускага дзяржаўнага музея. Сярод удзельнікаў экспедыцыі — М. Мялешка, А. Шлюбскі, М. Азбукін, Л. Дашкевіч. Зорнае суквецце даследчыкаў беларускай культуры!..**



Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі падрыхтаваў (Выдавецкі дом «Беларуская навука» выступіў выдаўцом) альбом-манаграфію «Забытая экспедыцыя 1923 года: ля вытокаў акадэмічнай этнаграфіі ў Беларусі». Аўтары даўно наспелага і ўнікальнага творчага, навуковага праекта — Сяргей Грунтоў, Яніна Грыневіч, Надзея Саўчанка — аўтарытэтныя даследчыкі беларускай культуры. Чытаем ва «Уводзінах»: «Нават сярод спецыялістаў, этнолагаў і фалькларыстаў толькі нямногія памятаюць пра экспедыцыю 1923 г., яшчэ менш тых, хто працаваў з яе фотаздымкамі і выкарыстоўваў у сваіх працах. Яна займае месца на маргінэсе навуковай літаратуры, узгадваецца ў асобных артыкулах, яе фотаздымкі часам трапляюцца ў краязнаўчай літаратуры і публікацыях у інтэрнэце — без пазначэння аўтарства і нярадка з памылковым годам у подпісе. Экспедыцыю нельга назваць невядомай, яна хутчэй «забытая» — бо засталася ў архіўных справах, газетных публікацыях, музейных зборах». І далей: «Па цэлым шэрагу прычын яна заслугоўвае большай вядомасці і лепшага месца ў памяці і беларускай культуры. Па-першае, гэта была першая вялікая этнаграфічная экспедыцыя, арганізаваная нядаўна створаным Інбелкультам разам з Дзяржархівам. Гэта экспедыцыя адзначае самыя пачаткі беларускай акадэмічнай этнаграфіі. Матэрыялы, сабраныя ў ёй, былі пакладзены ў аснову вопыту першай комплекснай рэпрэзентацыі розных бакоў і аспектаў беларускай народнай культуры на Усесаюзнай выставе ў Маскве. Пасля створаная тут экспазіцыя паслужыла асновай для прадстаўлення народнай культуры ў Беларускім дзяржаўным музеі ў Мінску. Гэта азначае, што навукоўцы, якія збіралі матэрыялы ў экспедыцыі, а пасля арганізавалі беларускі павільён у Маскве, сталі ля вытокаў фарміравання самапрэзентацыі беларускай нацыі і яе этнічнай культуры. Як выглядае тыповы беларускі дом? А беларускі краявід? А як выглядае тыповая беларуская сялянка і селянін? Як паказаць адметнасці краіны для саміх беларусаў і для прадстаўнікоў іншых рэспублік? Усе гэтыя пытанні сталі перад удзельнікамі экспедыцыі, і яе плён — досвед першых адказаў на іх».



Альбом-манаграфія складаецца з наступных раздзелаў: «Экспедыцыя 1923 года: падрыхтоўка і правядзенне» (аўтар — Н. Саўчанка); «Фотаздымкі і каментары» (у сваю чаргу ў змест уваходзяць два падраздзелы: «Першы этап. Да вытокаў Нёмана», «Другі этап. У Лагойск», аўтар — С. Грунтоў); «Першая Усесаюзная выстава 1923 года ў Маскве» (падраздзел «Падрыхтоўка ў Беларусі», аўтарам якога з'яўляецца Я. Грыневіч; і — «Свята народаў» — адкрыццё і правядзенне», аўтар — Н. Саўчанка); «Удзельнікі экспедыцыі 1923 года» (пра Міхася Мялешку, Аляксандра Шлюбскага, Мікалая Азбукіна расказвае Я. Грыневіч; пра Льва Дашкевіча — Н. Саўчанка); «Развіццё этнаграфіі і фалькларыстыкі ў 1920-я — пачатку 1930-х гг.» (аўтар — Я. Грыневіч).

Альбом-манаграфія — выданне, якое надзвычай багата крыніцазнаўчым матэрыялам. Праз цытаванне ўнікальных архіўных матэрыялаў, а таксама публікацый з тагачаснага перыядычнага друку сучасныя даследчыкі ствараюць партрэт дзейства, якое заклала асновы, сфарміравала грунт вялікай справы. Выданне, праз якое мы маем магчымасць зазірнуць у падзеі стагадовай даўніны, падасца надзвычай цікавым і для сённяшніх краязнаўцаў. Следам за вандроўнікамі 1923 года мы трапляем у Рудзенск, Цітву, Сяргеевічы, Шацк, Лошу, Даўгінічы, Узду, Негарэлае (сучасныя Пухавіцкі, Уздзенскі, Дзяржынскі раёны). Знаёмімся на фатаграфічных ілюстрацыях з моладдзю з Цітвы (гэта каля Рудзенска) і селянінам 67 гадоў з Сяргеевіч, маем магчымасць прайсціся па грэблі з Сяргеевіч на возера Муха. А ў Кавалевічах сюжэтам фотаздымка з'яўляецца перанясенне хаты. Уражлівым з'яўляецца і знаёмства з Хатлянамі і яе жыхарамі. Не меней цікавае падарожжа атрымаецца і праз агляд ілюстрацый, прысвечаных Лагойску і ваколіцам.

Высокая навуковая культура аўтараў альбома-манаграфіі — і ў расповедах пра ўдзельнікаў экспедыцыі. Фактычна перад чытачом паўстаюць міні-манаграфіі жыццяпісаў Льва Дашкевіча, Мікалая Азбукіна, Аляксандра Шлюбскага, Міхася Мялешкі. Унікліва чытаючы пра лёсы гэтых дзіўных, самаахвярных людзей, ловіш сябе на думцы, што з часам пра іх будуць напісаны кнігі, мо нават не толькі дакументальныя.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

# ТАЯМНІЦЫ БЕЛАРУСІ ЗАПАВЕДНАЙ

## Прайшла прэзентацыя кнігі Ігара Бышнёва «Нацыянальныя паркі — жамчужыны Беларусі»

**Прырода Беларусі заўжды ўражвала сваёй прыгажосцю, чысцінёй і неабсяжнасцю. Для таго каб хаця крыху яе вывучыць, трэба, як мінімум, дзясятак гадоў. Прыкладна такі час і працаваў над сваёй новай кнігай вучоны-арнітолаг, эколаг, рэжысёр дакументальнага кіно Ігар БЫШНЁЎ.**



Прэзентацыя яго працы пад назвай «Нацыянальныя паркі — жамчужына Беларусі» сімвалічна прайшла 11 студзеня, у Сусветны дзень запаведнікаў і нацыянальных паркаў, у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Гэтая кніга дазваляе ўбачыць прыгажосць роднай краіны з розных ракурсаў (у тым ліку з вышыні птушынага палёту), зазірнуць у самыя



запаведныя мясціны і нават «падглядзець» за жыццём жывёл, насякомых і птушак, у тым ліку і тых, што занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Акрамя таго, на старонках альбома можна знайсці інфармацыю аб розных славутасцях, экскурсіях, гасцініцах, месцах для палявання і рыбнай лоўлі.

Усяго ў сваёй працы аўтар ахапіў чатыры нацыянальныя паркі і два запаведнікі. Кніга даволі аб'ёмная (больш за 300 старонак), з вялікай кольказсцю яркіх унікальных фатаграфій.

— Тут праца дзесяці гадоў. Гэта пастаянныя экспедыцыі па Беларусі, па запаведніках, па нацыянальных парках, — дзеліцца Ігар Бышнёў. — Я заўсёды думаў, што кніга, у адрозненне ад кіно, дастаткова індывідуальная штука — усё ж пісьменнік працуе адзін. Але насамрэч гэта ў вышэйшай ступені вынік калектыўнай працы.

Так, сумесна з выдавецтвам «Беларусь» пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі была створана кніга, прысвечаная асабліва ахоўным тэрыторыям нашай краіны. Па словах аўтара, гэта быў рух насустрач з двух бакоў:

— Я задумаўся аб тым, што ёсць вельмі цікавы матэрыял, які было б выдатна адлюстраваць у кнізе. Патэлефанаваў у выдавецтва. Мне сказалі, ведаеце, гэта якраз тая тэма, якую замовіла дзяржава. Дык вось і атрымалася, што мы знайшлі адзін аднаго ў чарговы раз.

«У чарговы» — бо аўтар супрацоўнічае з гэтым выдавецтвам ужо на працягу 25 гадоў. Таксама Ігар Бышнёў прызнаўся, што падчас работы над матэрыялам адчуў, што ў гэтай кніжцы ёсць нешта кіношнае:

— Мы спрабавалі ў ёй сцэнарны рух зрабіць. Не толькі па сезонах, як звычайна, але таксама паказаць на развbabarotах кнігі нейкія мікрагісторыі, якія адпавядалі некаторым гісторыям нашых кінаработ. Ну а тэкст у дадзенай сітуацыі ідзе больш за ілюстрацыямі.

Сімвалічна, самы першы экзэмпляр дырэктар выдавецтва «Беларусь» Вікторыя Філіпкова перадала ў фонд Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. На самой жа прэзентацыі было бачна, што гэта выданне выклікае вялікую цікавасць.

***Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.***

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Гомельдрев», г. Гомель, ул. Достоевского, 3. УНП 400021353 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф. 5. УНП 191224638 (**www.ipmtorgi.by**) |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Объекты недвижимости (одним лотом) в составе: здание механизированной мойки (**инв. № 350/С-163612, 127,3 кв. м, составные части: пристройка, смот. яма, очист. сооружения), **КПП стоянки автотранспорта** (инв. № 350/С-163639, 53,2 кв. м), **навес со смотр. ямой (мехмойка)** (инв. № 350/С-163641, 76 кв. м), **очистные замазуч. и ливневых вод** (инв. № 350/С-170152, составные части: закрытый горизонт. отстойник), **дорожное покрытие** (инв. № 350/С-170155), **забор** (инв. № 350/С-170153, 386 м, составные части: 4 ограждения, ворота), **тепловая сеть** (инв. № 350/С-163618, 148,9 м, составные части: каналы, 2 опоры, камера, колодец), п**роизвод. водопровод** (инв. № 350/С-163611, 213,3 м, составные части: 2 трубопровода напорных, колодец, камера (2 шт.), **дожд. канализация** (инв. № 350/С-163609, 234,3 м, составные части: 4 трубопровода безнапорных, колодец, камера (13 шт.), дождеприемник, **гидроциклон ГЦ-15** (инв. № 3714), **устройства скребковые** (инв. №№ 3926, 3927) | |
| ***Сведения о земельном участке*:** предоставлен Продавцу общ. пл. **0,8989** га на праве постоянного пользования для размещения объектов неустановленного назначения. Ограничения – водоохранная зона водных объектов. Адрес: **Гомельская обл., г. Гомель, пер. Севастопольский 1-й, 53** | |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 137 686,49** (снижена на 80 %) | |
| Задаток **10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней после проведения электронных торгов |
